Юнакі выйшлі на старт, калі сонейка знікла ў шэрым палатне неба, а мароз стаў больш мяккім. Зрэшты, выступленне хлопцаў таксама адрознівалася значнай колькасцю штрафных «хвілін» і вялікімі адрывамі на фінішы. І толькі ў аднаго біятланіста атрымалася адстраляцца «на нуль». Вызначыўся датчанін Андэрс-Эміль Шылеруп, які ў выніку ўзняўся на другую прыступку п'едэстала.

Беларуса Рамана Шынкевіча, што да апошняга агнявога рубяжа захоўваў шанцы на пападанне ў прызавую тройку, трэцяя штрафная «хвіліна» адсунула на восьмую пазіцыю. Тым не менш, як лічыць сам Раман, дэбют на чэмпіянаце свету атрымаўся.



— Літаральна перад стартам «індывідуалкі» я захварэў. Спрабаваў правільна раскласці сілы па дыстанцыі, але не зусім атрымалася. Ды і апошні промах быў лішнім. Чаму так здарылася? Тут і стомленасць паўплывала, і калясальная адказнасць… На міжнародных спаборніцтвах я ўжо выступаў, але чэмпіянат свету — гэта зусім іншы маштаб. Тым больш хатні старт, дзе хочацца паказаць свой максімум. Спадзяюся, у спрынце гэта ў мяне атрымаецца.



Спартсмену з Бразіліі *(на пярэднім плане)* было няпроста, але ён, як і ўсе, змагаўся за перамогу.

Фота Надзеі БУЖАН.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**


## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Ордена Трудового Красного Знамени «Институт «БЕЛГОСПРОЕКТ» на праве хозяйственного ведения**

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Автомобиль Рено Траффик Комби номер рамы VF1JLJNB67Y176822 | г. Минск, пр. Победителей, 23, корп. 1 | 15 677 442 | 2 000 000 | 5 |

Тип ТС – легковой специальный вагон. Г.в. – 2006. Цвет – серебристый металлик. Кол-во пассажирских мест – 8. Пробег по одометру на 01.01.2015 – 167 916 км. Двигатель – 2 000 $см^3$ бензин. КП – механическая. Шины, диски – зима, штампованные. Оборудование: - рециркулятор отработанных газов; - бортовой компьютер; - подушка безопасности; - противоугонная сигнализация; - тахометр оборотов ДВС; - электростеклоподъемники;- противотуманные фары; - кондиционер; - подголовники; - регулировка клиренса; - механические зеркала заднего вида;- центральный замок; - п/угонное устройство; - отопитель.

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 2 | Автомобиль ГАЗ 2217 номер рамы 22170040142122 ХТН22170040386669 | г. Минск, пр. Победителей, 23, корп. 1 | 12 398 801 | 2 000 000 | 5 |

Тип ТС – легковой вагон. Г.в. – 2004. Цвет – серебристый металлик. Кол-во пассажирских мест – 6. Пробег по одометру на 01.01.2015 – 211 835 км. Двигатель – 2 400 $см^3$ бензин. КП – механическая. Шины, диски – зима, штампованные. Оборудование: - тахометр оборотов ДВС; - диски стальные; - подголовники; - механические зеркала заднего вида; - регулировка света фар.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 3 (трех) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта (Объектов).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона в размере, не превышающем 15 000 000 руб. по каждому лоту на основании счета-фактуры, в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 (далее – Положение) и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 10 000 000 рублей.

**Аукцион состоится 25.03.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением.

*Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Ордена Трудового Красного Знамени «Институт «БЕЛГОСПРОЕКТ» (Лот №__),* **проводимом 25 марта 2015 г.**

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **23.03.2015 в 12.00.** Заключительная регистрация участников **25.03.2015 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами) аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): Смирнова Наталья Петровна 8 (017) 203-98-92, 8 (029) 323-80-28.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Сямейная газета

Выпуск № 3 (26)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ДНЁМ З ЛІХТАРОМ

**Старажытнагрэчаскі філосаф Дыяген аднойчы ўдзень выйшаў на гарадскія вуліцы з запаленым ліхтаром. На здзіўленыя роспыты сустрэчных, што ён робіць, мудрэц адказваў: «Шукаю чалавека». Пры сустрэчы з самым што ні ёсць сапраўдным, паўнавартасным, ідэальным узорам маральнасці і душэўнай чысціні ліхтар Дыягена як быццам мусіў згаснуць. Ці трэба казаць, што пошукі гэтыя былі хоць і ўпартыя, але марныя…**

Не прэтэндуючы на званне мудраца і філосафа, часам усё ж адчуваю сябе Дыягенам. Прынамсі, практычна штораз, калі даводзіцца бываць на больш ці менш афіцыйных мерапрыемствах, прысвечаных сям'і і ахове мацярынства і дзяцінства. Практычна заўжды як мінімум тры чвэрці іх удзельнікаў і прысутных — жанчыны. Жанчыны расказваюць жанчынам пра тое, як выхоўваць дзяцей, клапаціцца пра іх здароўе, развіццё і адукацыю, змагацца з хатнім гвалтам, распавядаюць пра сістэму дзяржаўнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі, плануюць розныя сямейныя святы і падводзяць іх вынікі…

Мужчыны на падобных пасяджэннях і прэс-канферэнцыях прысутнічаюць гады ў рады, дый тое гэта адзіночныя грамадскія актывісты, святары, прадстаўнікі органаў улады ці праваахоўнікі.

Дайшло да таго, што кожную сустрэчу з мужам-выхавальнікам у дзіцячым садку, школьным настаўнікам, кіраўніком неспартыўнага гуртка ўспрымаеш, як нейкі цуд. Адзінкавыя выпадкі, калі таты карыстаюцца сваім (між іншым, замацаваным у заканадаўстве) правам пайсці ў дэкрэт і ўшчыльную займацца выхаваннем дзіцяці да трох гадоў — нагул з разраду стасункаў з іншапланетнай цывілізацыяй… Як вядучая тэматычнага сямейнага дадатку ў газеце, апошнія паўтара года я амаль што калекцыяную гэтыя сустрэчы, бо за кожнай з іх — тыя самыя ўзоры маральнасці, адказнасці за блізкіх, калі хочаце, сапраўдных мужчынскіх паводзін.

Літаральна ўчора закранулі паміж іншымі і гэту тэму ў размове з замежнай госцяй — еўрапейскай журналісткай з больш як 30-гадовым досведам працы ў СМІ у розных краінах свету. Паводле яе слоў, ніякімі рашэннямі, заканадаўчымі актамі і іншымі захадамі дзяржаўнага ўзроўню гэту праблему не вырашыць. Трэба, каб самі мужчыны, мужы і бацькі, «даспелі» да пераасэнсавання сваёй ролі ў выхаванні будучага пакалення, каб назапасілася нейкая крытычная маса, што зрушыць грамадскую думку ў патрэбным кірунку; нарэшце, каб тыя ж грамадскія актывісты перайшлі ад слоў да спраў.

Ці можна неяк прыспешыць гэты працэс, дапамагчы і паспрыяць? Магчыма. Прынамсі, мы з калегамі спрабуем — праз расповеды пра канкрэтных людзей, якія ўжо штосьці робяць і паказваюць варты пераймання прыклад іншым. Але збольшага — вы ж разумееце? — усё ў вашых руках.

…Пайду, запалю свой ліхтар.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Выгадаваць мужчыну

# ВЫХАВАННЕ ФУТБОЛАМ,
## або Як спорт загартоўвае характар

***…Дзіўная рэч адбываецца ва ўсіх навідавоку: выхаваннем дзяцей амаль да паўналецця займаюцца пераважна жанчыны: мамы, выхавальніцы ў садках, настаўніцы ў школах. Мужчыны ж у асноўным імкнуцца зарабіць грошы. І ўсе бакі гэта як быццам задавальняе. А потым мы здзіўляемся: чаму мноства ўжо дарослых хлопцаў такія інфантыльныя і нерашучыя, чаму ў транспарце «джэнтльменаў шмат, месцаў не хапае», і куды падзеліся сапраўдныя мужчыны? Напярэдадні аднаго з самых мужчынскіх свят мы распыталі пра тое, як правільна выхоўваць хлопчыкаў, каб не давялося потым выпраўляць памылкі, уласна тых спецыялістаў, хто працуе ў гэтым напрамку шмат гадоў. Прытым — выключна мужчын.***




Фота Надзеі БУЖАН.

**Трэнер-выкладчык СДЮШАР футбольнага клуба «Мінск» Аляксандр СТРУК расказаў пра тое, за што з каманды могуць адлічыць нават маленькага футбаліста і ў якім узросце варта весці хлопца ў футбольную секцыю.**

Дзясятак хлопчыкаў ад варот да варот ганяюць па паркеце мяч. Кожны з іх у душы Златан Ібрагімавіч і Ліянэль Месі, «зоркі» сусветнага футбола, а кожная трэніроўка — адказны матч. Яшчэ б! Бо за табой сочыць не толькі твой трэнер, але і бацькі, якія літаральна прыліплі да вокнаў кавярні ў офісе ФК «Мінск», з якой адкрываецца ндзрэнны агляд на тое, што адбываецца ў спартыўнай зале. Здаецца, малая толькі адчулі смак гульні, як гучыць свісток. Трэніроўка завершана.

— Летась ім споўнілася 7 гадоў,— кажа пра падапечных Аляксандр Струк, за плячыма якога 13 гадоў трэнерскай практыкі.— Займаюцца са мной два гады і ў футболе ўжо нешта рабіць умеюць.

**— Пры мне ў спартыўную школу запрашалі толькі ў другім класе, а вы сваіх выхаванцаў трэніруеце з 5-гадовага ўзросту.**

— І гэта нармальна. Калі раней галоўную ролю ў фізічным выхаванні дзіцяці адыгрываў двор, сёння з гэтым вялікая праблема: усе двары заняты аўтамабілямі і дзіцячых пляцовак не хапае. Вось і прыводзяць да нас 5-гадовых дзетак. Між іншым, у параўнанні з іншымі футбольны рост лепш заўважны ў тых, хто прыйшоў займацца раней.

**— Аляксандр Іванавіч, але як захапіць дзіця спортам, калі ў інтарэсах дамінуюць камп'ютарныя гульні?**

— Бацькам трэба растлумачваць, што самае галоўнае ў першыя гады навучання ў школе — гэта здароўе, заняткі спортам і фізкультурай. Усе насамрэч добра ведаюць, якую шкоду нясе празмернае захапленне камп'ютарнымі гульнямі, а спорт выхоўвае ў хлопчыку будучага мужчыну, вучыць трымаць распарадку дня, правільна харчавацца. Пра гэта магу меркаваць па сваіх сынах (абодва нарадзіліся ў 2007-м), якія раніцай падымаюцца ў адзін і той жа час, снедаюць, абедаюць. У іх дзень распісаны, як у дарослага чалавека. Гэта прывівае ім дысцыпліну.

**— Дарэчы, ці паменшыўся колькасна набор юных футбалістаў?**

— У нашым выпадку трэба казаць пра адбор. Для выхавання дзяцей у футбольнай школе «Мінск» створаны добрыя ўмовы, і кожны год на прагляд прыходзяць вельмі шмат хлопчыкаў. На жаль, усіх узяць не можам. Стараемся разглядзець найбольш таленавітых. Дзеля гэтага звяртаем увагу на хуткасць, фізічныя якасці, на характар. Здараецца, што дзіця трапіла ў новы асяродак, збянтэжылася і не здолела праявіць свае лепшыя здольнасці. Аднак сумаваць не трэба. Мы гатовы пасля даць яшчэ адзін шанц прайсці прагляд. А калі зноў не атрымалася, падкажам адрасы іншых футбольных клубаў.

**— Цікава, а як вы псіхалагічна працуеце з падапечнымі?**

— У кожнага з хлопцаў свой характар. Працаваць прыходзіцца індывідуальна. Кагосьці трэба паўшчуваць, крыху прыкрыкнуць, а для іншага патрэбна змястоўная размова, колькі добрых слоў пра выдатныя дзеянні на футбольным полі. Школьнікі прыносілі мне дзённікі. Я наладзіў кантакт з настаўнікамі, і пакуль хлопцы не паляпшалі вучобу, на спаборніцтвы іх ніхто не адпускаў. Тут усё ўзаемазвязана. Калі ў школе ўсё добра, тады і ў футболе ўсё будзе няблага.

**«Калі раней галоўную ролю ў фізічным выхаванні дзіцяці адыгрываў двор, сёння з гэтым вялікая праблема: усе двары заняты аўтамабілямі і дзіцячых пляцовак не хапае. Вось і прыводзяць да нас 5-гадовых дзетак».**

**— Ці даводзілася вам кагосьці выключаць з каманды?**

— Так. Бо каманда — гэта калектыў, а ў ім заўжды павінна быць добрая атмасфера. А калі хлопец мае футбольны талент, але не адпавядае ўзроўню ўзаемаадносін, ён больш нашкодзіць сваімі дзеяннямі, чым дапаможа.

*(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)*

■ Трэці ўзрост

# ПАТРАБУЮЦЦА НАСТАЎНІКІ… ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ

**Камп'ютарныя курсы для пажылых людзей, зладжаныя ў межах сацыяльна-асветніцкай праграмы кампаніі «МТС» «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя», адчыняюць новыя класы ў Мінску, Гомелі, Гродне і Наваполацку і набіраюць выкладчыкаў.**



Ужо гэтай вясной беларускія пенсіянеры змогуць прайсці курсы камп'ютарнай асветы ў 30 вучэбных цэнтрах. Для выкладання ў іх плануецца задзейнічаць каля 150 валанцёраў, а ў праграму будзе ўключаны новы кірунак — вывучэнне планшэтаў і смартфонаў. У прыватнасці, як расказалі прадстаўнікі кампаніі, у сталіцы адкрыюцца вучэбныя класы ў цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання Партызанскага і Ленінскага раёнаў, а таксама ў Мінскай раённай бібліятэцы ў Міханавічах.

«За паўтара года існавання праекта мы пераканаліся, што ён не толькі выконвае адукацыйную функцыю, але і насамрэч вырашае вельмі вострую праблему нашага грамадства: дапамагае людзям рознага ўзросту лепш разумець адзін аднаго, а старэйшаму пакаленню дазваляе больш камфортна і ўпэўнена адчуваць сябе ў свеце сучасных тэхналогій,— адзначае кіраўнік камерцыйнага дэпартамента «МТС» Яўген Бранцаў.— Менавіта таму праграма набывае больш шыя маштабы і пашыраецца як у Мінску, так і ў рэгіёнах».

Каб далучыцца да каманды валанцёраў-выкладчыкаў камп'ютарных курсаў, ахвотным трэба да 15 сакавіка пакінуць заяўку на сайце vozrast.mts.by, дзе можна выбраць найбольш зручны для сябе вучэбны клас і час правядзення заняткаў.

Дарэчы, за час дзеяння асветніцкага праекта «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя» навучыліся стасавацца з камп'ютарамі, інтэрнэтам і сучаснымі прыладамі ўжо амаль 2 тысячы пажылых «курсантаў».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Ніколі не позна?

# ШЧАСЦЕ — БЫЦЬ МАМАЙ!



**Нядаўна сустрэла сваю знаёмую, якой 49 гадоў. Яна шпацыравала са сваёй пяцігадовай унучкай і... дачкой такога ж узросту. Жанчына выглядала вельмі шчаслівай і не камплексавала ад таго, што ў яе дачка і ўнучка — аднагодкі. Расказала, што цяжарнасць у свае «далёка за 40» яна не планавала, але аплакваць сваё становішча таксама не збіралася. Наадварот, радавалася ад усёй душы, што ёй пашанцавала стаць трэці раз мамай. Праўда, падчас яе цікавага становішча жанчыне было няпроста ў фізічным і псіхалагічным плане, да таго ж у яе абвастрылася язва і некаторы час яна пакутавала ад боляў. Але пасля таго, як з дапамогай урачоў наладзіла дыету, болі зніклі. Яна ўпэўнена, што яе малодшая дачка падоўжыла ёй маладосць. Сёння ў жанчыны шмат клопатаў, таму ў яе проста няма часу старэць.**

Прыхільнікаў позняга бацькоўства ў нашай краіне становіцца ўсё больш, і так ці інакш спецыялістам прыходзіцца працаваць з жанчынамі, якія нараджаюць у сорак гадоў, тым больш калі нараджаюць упершыню. **Намеснік дырэктара па акушэрстве і гінекалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Святлана НАГІБОВІЧ** расказала, з якімі праблемамі сутыкаюцца «маладыя» мамы постбальзакаўскага ўзросту.

**— Святлана Юр'еўна, сёння ва ўсім свеце ўсе больш жанчын «пад сорак» становяцца мамамі ўпершыню. Звычайна гэта звязана з тым, што жанчыны вырашаюць спачатку дасягнуць пэўнага сацыяльнага і прафесійнага статусу перад тым, як прысвяціць сябе сям'і. Ці датычацца гэтыя тэндэнцыі Беларусі?**

— У нас колькасць «маладых» мам, якім бліжэй да сарака, таксама павялічылася. За апошнія дваццаць гадоў жанчын, якія нарадзілі першае сваё дзіця ва ўзросце паміж 30 і 40 гадамі, стала ў тры разы больш. Сёння кожнае дзясятае дзіця нараджаюць жанчыны, якім ужо за 35 гадоў. У гэтым адкладанні першай цяжарнасці ёсць свае рызыкі.

Фертыльнасць жанчын пачынае паніжацца за шмат гадоў да наступлення менапаўзы. Узнікненне бясплоддзя ў жанчын пасля 35 гадоў павышаецца ў некалькі разоў. Напрыклад, працэнт бяздзетных жанчын у шлюбе 15% — у 30-34 гады, але ўжо 30% — у 35-39 гадоў. Іншымі словамі, амаль траціна жанчын, якім за 35 гадоў, лічацца бясплоднымі.

**— Чаму так здараецца?**

— Гэта звязана з узроставымі зменамі тканак маткі і яечнікаў, якія цягнуць за сабой зніжэнне іх функцыянальных асаблівасцяў. Узроставыя змены арганізма, перш за ўсё, датычацца крывяноснай сістэмы і пры гэтым выяўляюцца ў органах, якія недастаткова эфектыўна працуюць. У жанчын, якія доўга не нараджалі, адпаведныя ўнутраныя органы знаходзяцца ў стане функцыянальнай недастатковасці і таму падвяргаюцца заўчаснаму старэнню. Нават здаровай жанчыне старэйшай узроставай групы можа спатрэбіцца для зачацця больш часу.

Аднак часам цяжарнасць такім матулям рыхтуе не толькі праблемы, але і прыемныя сюрпрызы. Напрыклад, зацяжараць двайняткамі і трайняткамі часцей атрымліваецца менавіта ў гэтым «спелым» узросце.

**«У жанчын, старэйшых за 40 гадоў, у 3 разы часцей, чым да 30, развіваецца гестацыйны цукровы дыябет, узмацняюцца захворванні сардэчна-сасудзістай і мочапалавой сістэм».**

**— Калі жанчына ўсё ж зацяжарала, з якімі праблемамі яна можа сутыкнуцца?**

— Бліжэй да 40 гадоў у жанчын павялічваецца рызыка нарадзіць дзіця з прыроджанай паталогіяй. Сярод іх — парокі сэрца, страўнікава-кішачнага тракта, касцёва-мышачнай сістэмы; нярэдка сустракаецца хвароба Даўна. Важны тут і ўзрост бацькі (у траціне выпадкаў развіцця сіндрому Даўна «вінаватыя» менавіта паталогіі ў мужчынскіх храмасомах).

Рызыка якога-небудзь генетычнага парушэння ў выніку выпадковай мутацыі прысутнічае заўсёды, нават у маладой жанчыны, але з узростам парушаецца механізм, які дазваляе адрозніваць здаровы эмбрыён ад хворага, і калі маладыя арганізм можа проста адрынуць такі эмбрыён, то пасля 35-гадовага ўзросту спантанных мутацый становіцца больш, а ахоўны механізм не заўсёды спрацоўвае.

Складанасць у тым, што да зачацця нельга прадказаць і дакладна спрагназаваць магчымасць зачацця дзіцяці з той ці іншай храмасомнай паталогіяй, у тым ліку і з сіндромам Даўна, можна толькі вылічыць ступень рызыкі з'яўлення паталогіі.

Рызыкі ў позняй цяжарнасці ёсць не толькі для будучага дзіцяці, але і для маці.

У жанчын, старэйшых за 40 гадоў, у 3 разы часцей, чым да 30, развіваецца гестацыйны цукровы дыябет, узмацняюцца захворванні сардэчна-сасудзістай і мочапалавой сістэм.

Але ёсць і фізіялагічныя плюсы ў позняга мацярынства: пазней надыходзіць менапаўза; памяншаецца рызыка астэапарозу, інсульту і інфаркту. Больш за тое, потым значна лягчэй надыходзіць менапаўза.

**— Як уплывае на здароўе будучага дзіцяці ўзрост мужчыны?**

— З узростам у мужчын павялічваецца колькасць пашкоджанага генетычнага матэрыялу. Гэта звязана з тым, што на якасць спермы ўплывае мноства неспрыяльных фактараў: шкодныя звычкі, дрэнная экалогія, прыём лекавых прэпаратаў і іншыя. Пры цяжарнасці ва «ўзроставых» бацькоў узрастае рызыка ўскладненняў падчас выношвання. Больш за тое, нават зацяжараць ад мужчыны, якому за 40, шанцаў у 3 разы менш, чым ад маладзейшага. Але калі атрымліваецца ўсё добра, то, як адзначаюць псіхолагі, таты ва ўзросце больш уважлівя і пяшчотна ставяцца да сваіх дзетак, чым у маладосці. Яны трапятліва падыходзяць да выхавання спадчыннікаў і сур'ёзна клапоцяцца аб іх будучыні. Калі мужчына і жанчына ва ўзросце пад 40 і больш плануюць дзіця, то лепей за ўсё загадзя да гэтага пытання дасканала падрыхтавацца. Будучым бацьку і маці варта абавязкова наведаць медыка-генетычную кансультацыю. Мужчыну неабходна будзе здаць аналіз для ацэнкі якасці спермы.

**«За апошнія дваццаць гадоў жанчын, якія нарадзілі першае сваё дзіця ва ўзросце паміж 30 і 40 гадамі, стала ў тры разы больш».**

Сёння можна разлічваць на высокі ўзровень прэнатальнай дыягностыкі, здольнай выявіць прысутнасць спадчынных сіндромаў у эмбрыёне на тэрміне цяжарнасці да 22 тыдняў.

**— Як правільна падрыхтавацца да цяжарнасці жанчынам, якім каля сарака, каб паменшыць колькасць рызык?**

— Што тычыцца жанчыны, то ўсё значна складаней. Жанчыне да зачацця дзіцяці лепш падрыхтавацца грунтоўна. А часам такая падрыхтоўка з'яўляецца абавязковай, інакш цяжарнасць проста не наступіць. Планаванне цяжарнасці нават ужо пасля 30 павінна пачынацца з абследавання ў гінеколага. Абаім партнёрам трэба праверыцца на палавыя інфекцыі. У выпадку іх выяўлення трэба будзе прайсці курс лячэння, і толькі пасля гэтага займацца планаваннем цяжарнасці.

Калі ў жанчыны ёсць нейкія хранічныя хваробы, неабходна абавязкова пракансультавацца з урачом, у якога яна назіраецца. Асабліва гэта тычыцца сардэчных захворванняў, варыкознага пашырэння вен, гіпертанічнай хваробы, цукровага дыябету, збояў эндакрыннай сістэмы і іншых. Пры неабходнасці лепей прайсці прафілактычнае лячэнне. Неабходна таксама наведаць стаматолага і акуліста. Калі не схадзіць да стаматолага своечасова, ёсць рызыка абзавесціся сур'ёзнымі праблемамі на пару гадоў наперад. Пры гэтым усім вядома, што карыес — гэта ўваходныя вароты для інфекцый. Што ж тычыцца абследавання ў акуліста, яго лепш правесці на этапе, калі ідзе планаванне цяжарнасці, каб пазбегнуць праблем пры родах. Перад цяжарнасцю нядрэнна паклапаціцца і аб фізічнай форме — стабілізаваць сваю вагу, прывесці мышцы ў тонус. Для гэтага перш за ўсё трэба нармалізаваць харчаванне, уключыць у рацыён морапрадукты, гародніну, садавіну, сокі і г.д. Часцей гуляць на свежым паветры, пазбягаць разнастайных стрэсаў і дэпрэсіўнага стану. Калі спланаваць рацыён ідэальна не атрымліваецца, то за 2-3 месяцы пачніце прымаць, напрыклад, звычайныя полівітаміны або вітаміны для цяжарных.

Акрамя гэтага, на этапе планавання абаім партнёрам выдатна падыдуць разнастайныя травяныя зборы, якія ўмацоўваюць імунітэт. Патрэбна выключыць алкаголь з рацыёну ўвогуле за тры месяцы да зачацця. Калі бацькі ва ўзросце будуць ставіцца да планавання цяжарнасці сур'ёзна, то, нягледзячы на некаторыя складанасці, шанц нарадзіць здаровае дзіця значна павялічваецца.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ** ■

# НОРМА ЦІ... ПОДЗВІГ?

**Сяргей ВАХРАМЕЕЎ, інжынер цепласетак:**

— Не думаю, што ў дзіцяці абавязкова ўзнікнуць праблемы і комплексы з прычыны таго, што яно «позняе». Мая маці адважылася нараджаць на 5 гадоў пазней, чым большасць яе сяброваk, і ёй было ўжо амаль 40, калі я з'явіўся на свет. Але ні ў дзяцінстве, ні ў падлеткавым узросце я і не думаў саромецца, а наваколльныя — нейкім чынам кпіць з гэтага. Бо, па-першае, мама заўжды выглядала дагледжанай, падцягнутай і маладзейшай за свой узрост, па-другое, яна па жыцці актыўны чалавек, і мы з ёю і татам здзейснілі столькі пешых турыстычных паходаў, што і не снілася маім равеснікам з больш маладымі, але цяжэйшымі на пад'ём бацькамі, якія на канікулы спіхвалі дзяцей то да бабуль на вёску, то ў піянерскі летнік. А калі б хто рызыкнуў сказаць, чаму гэта маці ў цябе такая старэнькая, — па шчырасці, я панадаваў бы такому кухталёў.

Мама і цяпер, ужо даўно знаходзячыся на пенсіі і даглядаючы двух унукаў, выглядае больш бадзёрай і маладзейшай за многіх 50-55-гадовых жанчын. Вядома, з узростам у яе абвастрыліся некаторыя праблемы са здароўем, але, ведаеце, для мяне гэта ніколі не складала праблемы — ні падчас вучобы ў тэхнікуме, ні цяпер — праявіць больш увагі і клопату да аднаго з самых дарагіх людзей у жыцці.




**Ірына ЮШКЕВІЧ, банкаўскі спецыяліст па рабоце з кліентамі:**

— Безумоўна, усё павінна адбывацца ў свой час, і ў адной жанчыны біялагічны гадзіннік можа ісці крыху хутчэй, а ў другой — крыху павольней. Цалкам зразумелае і жаданне забяспечыць сваё будучае дзіця як мага лепш, даць яму больш магчымасцяў для развіцця, адукацыі, уматавання здароўя і г.д. Але, я лічу, пры ўсіх гэтых разліках нельга забывацца на самае галоўнае: які правільны лад жыцця ні вядзі, з узростам наш арганізм усё адно зношваецца, узрастае рызыка ўскладненняў, паталогій, хранічных хвароб. Таму адкладваць такі важны момант, як цяжарнасць і нараджэнне дзіцяці, можна ў пэўных разумных межах, але ж не да 50! Плюс яшчэ такі тонкі маральны момант: ці ўпэўнены тыя, хто вырашае нараджаць пасля 40, што не асуджаюць сына ці дачку на долю няньки пры цяжкахворым, што праз 10-15 гадоў яны ўсё яшчэ будуць здольныя забяспечваць сваіх дзяцей і клапаціцца аб іх належным чынам? Калі здароўе і матэрыяльнае становішча дазваляюць рабіць пазітыўныя доўгатэрміновыя прагнозы — калі ласка, тут можна толькі па-добраму пазайздросціць. А калі гэта выключна эгаістычнае жаданне бацькоў займець «лялькю» пад старасць гадоў — асабіста мне шкада іх дзяцей...

• ДАРЭЧЫ

# НАЙСТАРЭЙШЫЯ ПАРАДЗІХІ Ў СВЕЦЕ



**Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў Савецкім Саюзе маладая жанчына, якая адважвалася ўпершыню нарадзіць дзіця ў 24-25 гадоў, атрымлівала ў медыцынскую картку запіс «старародзіцая». Зрэшты, праз некалькі дзесяцігоддзяў гэты ўмоўны парог адсунулі да 28 гадоў, потым — да 30, а ў наш час збольшага стараюцца не ўжываць наогул. «Познімі» лічацца першыя роды, якія адбыліся ў 35 гадоў ці пазней, але дзякуючы дасягненням сучаснай медыцыны нараджаюць і нашмат старэйшыя жанчыны — было б жаданне, магчымасці і запас здароўя.**

***У своеасаблівым рэйтынгу найстарэйшых маці ў свеце лідзіруе індыянка Омкары ПАНВАР, якая ў 2008 годзе нарадзіла блізнят, хлопчыка і дзяўчынку. Жанчыне было на той час 70 гадоў, і яна ўжо мела 2 дарослых дачок і 5 унукаў. Але яе 77-гадовы муж вельмі хацеў пакінуць пасля сябе спадчынніка мужчынскага полу, таму сям'я, заклаўшы ўсю сваю маёмасць, вырашылася на ЭКА. Праўда, афіцыйна гэты рэкорд нідзе не зарэгістраваны, бо Панвар не мела дакументаў, што пацвярджалі б яе ўзрост.***

***Затое ў Кнізе рэкордаў Гінэса зафіксаваны выпадак іспанкі Марыі дэль Кармен БУСАДА, якая за некалькі дзён да 67-годдзя нарадзіла ў 2006 годзе з дапамогай кесарава двойню хлопчыкаў — праўда, зноў жа зачатых з дапамогай штучнага апладнення. На жаль, праз некалькі гадоў блізняты засталіся сіротамі — найстарэйшая маці ў свеце памерла ад раку.***

***Сярод мам, якія нарадзілі дзяцей, зачатых натуральным шляхам, самай узроставай парадзіхай з'яўляецца Дэн БРУК — у 1997 годзе гэтая жыхарка востраў Гернсі (належыць да ўладанняў Вялікабрытаніі) ва ўзросце 59 гадоў нарадзіла здаровага сына.***

***Адзначыліся ў спісе і жыхаркі краін СНД. Напрыклад, расіянцы Наталлі СУРКОВАЙ было ўжо 57 гадоў, калі яна ў 1996 годзе нарадзіла дачку, якая стала трэцім дзіцем у сям'і. А вось Раіса АХМАДЗЕЕВА з Ульянаўска, маючы 56 пашпартных гадоў за плячыма, у 2006 годзе нарадзіла першынца — сына. А самай узроставай мамай на Украіне, ды і ўсёй СНД, стала жыхарка Чарнігава Валянціна ПАДВЕРБНАЯ — сваю дачку, якая з'явілася на свет у 2011 годзе, жанчына нарадзіла ажно ў 65 гадоў!***

■ Медагляд

# ЦЯЖАРНАСЦЬ ПА ПРАВІЛАХ



**Вось яны, запаветныя дзве палоскі! Выбух эмоцый і жаданне як мага хутчэй трапіць на прыём да гінеколага, каб даведацца пра тэрмін і стаць на ўлік. А можа быць і адваротная рэакцыя: «Зараз пачнецца: бясконцыя паходы да гінеколага, здача аналізаў. Навошта ўсё гэта, калі цяжарнасць — не хвароба? Жылі ж неяк без усяго гэтага нашы бабулі».**

— Раней у жанчын было па 7-9 дзяцей, дзіцячая і мацярынская смяротнасці сустракаліся досыць часта, а да невыношвання цяжарнасці ставіліся як да рэальнасці жыцця, — тлумачыць **урач акушэр-гінеколаг 12-й гарадской паліклінікі г. Мінска Вольга ГРЫШАНКОВА.** — Сучасная жанчына іначай ставіцца да такога "звычайнага" стану, як цяжарнасць. Любая няўдача ўспрымаецца як трагедыя, любое ўскладненне павінны вылечыць. А сённяя цяжарнасць часта працякае з нейкімі ўскладненнямі. Своечасовы зварот да гінеколага і абследаванне зніжаюць іх рызыку, так што аналізы пры цяжарнасці вельмі неабходныя.

Як правіла, план вядзення цяжарнасці ўключае абавязковыя візіты ў жаночую кансультацыю: першую палову цяжарнасці кожныя 4-6 тыдняў, пасля 30 тыдняў — раз на 2 тыдні. Жанчынам выдаецца абменная картка — «пашпарт цяжарнасці», у якім пазначаюцца вынікі ўсіх даследаванняў. У 30 тыдняў даецца бальнічны ліст на 126 дзён.

## Якія абследаванні неабходна прайсці падчас цяжарнасці?

● **Вымярэнне і дынаміка масы цела.** За час цяжарнасці жанчына павінна набраць 10-12 кг. Але бывае, што некаторыя прыбаўляюць і больш за 20 кг. Паталагічная прыбаўка ў вазе — адзін з ранніх сімптомаў сур'ёзнай паталогіі, якая называецца гестоз. Узнікае гэты стан з прычыны змяненняў у арганізме цяжарнай, у выніку якіх парушаецца пранікальнасць дробных сасудаў, узнікаюць ацёкі.

Гестоз каварны. Жанчына доўга можа адчуваць сябе здаровай — ні галава, ні ныркі не баляць. Аднак плацэнта, што складаецца з мноства сасудаў, у якіх адбыліся непажаданыя змены, перастае спраўляцца са сваёй асноўнай функцыяй дастаўкі кіслароду і спажыўных рэчываў плоду. Ён пакутуе ад кіслароднага галадання, затрымліваецца яго развіццё. Паражаецца і галаўны мозг. Такія сімптомы, як галаўны боль, млоснасць, «мурашы» перад вачыма, санлівасць, затармажанасць, боль у страўніку з'яўляюцца за некалькі гадзін ці хвілін да прыступу сутаргаў, якія пагражаюць жыццю і маці, і дзіцяці. Такі стан называецца прээклампсіяй, а сам сутаргавы прыступ — эклампсіяй. На фоне гэтага стану развіваюцца інфаркт, інсульт, ацёк лёгкіх, адслаенне плацэнты і сятчаткі вока, ныркавая і пячоначная недастатковасць.

● **Вымярэнне пульсу і артэрыяльнага ціску.** Спалучэнне цяжарнасці і павышанага ціску, а таксама іншых захворванняў сэрца і сасудаў у некалькі разоў павялічваюць рызыку няўдалай цяжарнасці і магчымых ускладненняў для маці.

● **Агульны аналіз мачы.** Яго трэба здаваць перад кожным візітам, каб не прапусціць павышэнне лейкацытаў, з'яўленне бактэрый. Таксама ў мачы можа быць глюкоза і ацэтон, што можа ўказваць на абумоўлены цяжарнасцю (гестацыйны) цукровы дыябет. Ацэтон у мачы з'яўляецца і пры ранніх таксікозах. Урэшце, бялок у мачы дапамагае выявіць усё той жа гестоз.

● **Агульны аналіз крыві** прызначаюць пры першым наведванні, у 18, 28, 34-36 тыдняў цяжарнасці. Даследаванне дазваляе ацаніць гемаглабін, хуткасць асядання эрытрацытаў і колькасць лейкацытаў. Гемаглабін патрэбны для транспарціроўкі кіслароду. Яго зніжэнне часта назіраецца ў цяжарных, аднак калі ён падае ніжэй за 110, то гэта дрэнна і патрабуе лячэння. Лейкацыты павышаюцца ў крыві пры наяўнасці інфекцыі.

● **Вызначэнне групы крыві і рэзус-фактара** неабходна для таго, каб у будучыні дакладна ведаць, якая кроў патрэбна жанчыне ў выпадку кровацячэння. Рэзус-фактар дазваляе высветліць, ці можа быць рэзус-канфлікт у маці і дзіцяці. Такая сітуацыя ўзнікае, калі ў жанчыны рэзус адмоўны, а ў бацькі станоўчы. Рэзус-канфлікт выяўляецца з дапамогай кантролю спецыяльных антыцел на працягу ўсёй цяжарнасці: 1 раз на месяц да 30 тыдняў, далей — 1 раз на два тыдні.

● **Каагулаграма** — даследаванне згусальнасці крыві, робіцца двойчы: падчас пастаноўкі на ўлік і ў 22 тыдні. Парушэнні згусальнай сістэмы крыві пагаршаюць харчаванне плода, прыводзяць да плацэнтарнай недастатковасці, замірання цяжарнасці. У такіх пацыентак часта здараюцца заўчасныя роды, дзеці маюць малую вагу і прыкметы кіслароднага галадання. Калі колькасць фактараў згусання павялічаная, расце рызыка трамбозу або матачна-плацэнтарнай недастатковасці. У такіх выпадках прымаюцца меры па разрэджванні крыві.

● **Абследаванне на інфекцыі,** якія перадаюцца палавым шляхам. Своечасова не выяўленая і не праклечаная вірусная ці бактэрыяльная інфекцыя — вядучы фактар невыношвання, паталогіі развіцця і нават гібелі плода.

● **Даследаванне крыві на TORCH-інфекцыі** вызначае антыцелы імунаглабулінаў класа G і M да токсаплазмозу, герпесу, цытамегалавіруса, краснухі. Клас G сведчыць аб імунітэце і перанесеным кантакце з гэтай інфекцыяй, клас M указвае на абвастрэнне і патрабуе лячэння.

● **Абследаванне на ВІЧ, гепатыты і сіфіліс.** На сіфіліс — пры першым візіце, у 28-30 і 34-36 тыдняў, ВІЧ і гепатыты — пры першым візіце і ў 28-30 тыдняў. Пералічаныя інфекцыі вельмі небяспечныя, асабліва для плода.

● **Даследаванне крыві на глюкозу** — пры першым візіце, у 22 тыдні. Калі ў жанчыны ёсць схільнасць да дыябету, фактары рызыкі (сваякі з такім дыягназам, вялікая вага, нараджэнне дзяцей з вялікай вагой), прызначаецца глюкозаталерантны тэст у 26-28 тыдняў.

● **Электракардыяграма** — пры першым візіце. Для выяўлення магчымых парушэнняў сардэчнага рытму.

● **Біяхімічнае даследаванне крыві** — пры першым візіце, у 28, 34 тыдні. Для аналізу стану ўнутраных органаў і ферментаў у арганізме. Падчас цяжарнасці могуць павышацца пячоначныя ферменты пры некаторых ускладненнях (гепатоз, гестоз).

● **Гармоны шчытападобнай залозы** — пры першым візіце. Недахоп або лішак іх можа быць пагрозай невыношвання і парушэння функцыі шчытападобнай залозы ў дзіцяці.

● **Кансультацыі спецыялістаў: оталарынголага, афтальмолага, стаматолага, эндакрынолага** — да 12 тыдняў, **тэрапеўта** — да 12 тыдняў і ў 30 тыдняў. Лячыць карыес падчас цяжарнасці неабходна не толькі таму, што пасля родаў стан зубоў значна пагаршаецца, але і таму, што ён з'яўляецца дадатковым ачагом інфекцыі. Для выяўлення інфекцыйных ачагоў неабходны і агляд оталарынголага. Акуліст выяўляе захворванні вачэй, у тым ліку пашкоджанне сятчаткі, пры якіх паказана кесарава сячэнне. Агляд эндакрынолага важны, паколькі захворванні шчытападобнай залозы і парушэнне абмену глюкозы цесна звязаны з магчымасцю паспяховага зыходу цяжарнасці.

● **Агляд гінеколага.** Па выніку даследавання можна сказаць, ці ёсць запаленне ў ніжніх палавых шляхах (у гэтым выпадку выяўляецца павышаная колькасць лейкацытаў), можна выявіць трыхаманадную і ганакокавую інфекцыі, якія патрабуюць антыбактэрыяльнага лячэння. Любыя мікраарганізмы могуць стаць праблемай, паколькі яны здольны пранікаць у поласць маткі і выклікаць захворванні ў плода. Акрамя таго, інфекцыя з'яўляецца частай прычынай заўчаснага адыходу калаплодных водаў і заўчасных родаў.

● **Акушэрскае абследаванне** праводзіцца з 2-га трыместра. Неабходна для ацэнкі тэмпаў росту маткі і плода.

● **Праслухоўванне сэрцабіцця плода,** вызначэнне палажэння плода з 2-й паловы цяжарнасці. Праводзіцца для ацэнкі стану плода і выбару спосабу родаў.

● **Кардыятокаграфія** — з 28-га тыдня. Для ацэнкі сэрцабіцця, агульнага стану і магчымага кіслароднага галадання ў плода.

● **Ультрагукавое даследаванне.** На 11-13-м тыдні вызначаецца тэрмін цяжарнасці і колькасць пладоў, магчымыя грубыя парокі развіцця нервовай сістэмы, органаў брушной поласці і канечнасцяў, вымяраецца таўшчыня скуранай складкі для вызначэння рызыкі нараджэння дзіцяці з сіндромам Дауна. Медыка-генетычнае кансультаванне праводзіцца па паказаннях. Урач-генетык ацэньвае рызыку нараджэння дзіцяці са спадчыннай паталогіяй. У ідэале ўсе пары павінны наведаць гэтага спецыяліста, але яго кансультацыя абавязковая для тых сем'яў, у якіх ужо нараджалася малое з генетычнымі адхіленнямі, ёсць спадчынныя захворванні або парокі развіцця, кроўнасваякі шлюб, жанчына старэйшая за 35 гадоў, мужчына старэйшы за 50 гадоў, былі самаадвольныя выкідышы, цяжарнасць, якая перастала развівацца, унутрывантробная гібель плода, мёртванараджэнне, будучыя бацькі падвяргаліся працягламу ўздзеянню шкодных фактараў (радыяцыя, хімічныя злучэнні і інш.).

На 18-21-м тыдні прызначаецца чарговае планавае УГД. Цяпер урач вывучае будову цела малога, адсочвае, ці няма прыроджаных парокаў развіцця ўнутраных сістэм арганізма, вызначае пол дзіцяці, колькасць і якасць калаплодных водаў, месца прымацавання плацэнты і яе стан.

У 32-35 тыдняў УГД ацэньвае колькасць і якасць водаў, адпаведнасць памераў малога тэрміну, стан плацэнты і інш. Можа праводзіцца доплеграфія — даследаванне, якое дазваляе ацаніць крыявток у сасудах маткі, плацэнты і асноўных сасудах дзіцяці.

Цяжарным, якія адносяцца да групы рызыкі, прапануецца прайсці дадатковыя абследаванні.

**Святлана БАРЫСЕНКА** ■

### МІНУС НЕРВЫ, ПЛЮС УЗНАГАРОДА

**Пасля родаў жанчыну чакае пэўная матэрыяльная падтрымка: выплата дзяржаўнай дапамогі. Права на яе маюць жанчыны, у тым ліку сурагатныя маці, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12 тыдняў цяжарнасці, рэгулярна наведвалі гэтыя ўстановы і выконвалі прадпісанні спецыялістаў цягам усёй цяжарнасці. Для прызначэння дапамогі па месцы працы неабходна прадставіць заяву, пашпарт, заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі (з паліклінікі).**

■ Афіцыйна

## ШМАТДЗЕТНЫХ СЕМ'ЯЎ ПАБОЛЬШАЛА

**У параўнанні з мінулым годам колькасць шматдзетных сем'яў у Мінску вырасла. Паводле інфармацыі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, цяпер у сталіцы на ўліку ў органах сацыяльнай абароны знаходзіцца 9,9 тысячы вялікіх сем'яў, дзе выхоўваюцца амаль 31,5 тысячы дзяцей.**

Як адзначыла **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Жанна РАМАНОВІЧ,** рост колькасці шматдзетных сем'яў у Мінску шмат у чым абумоўлены актыўнай рэалізацыяй рэгіянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Прынамсі, на дзяржаўную падтрымку вялікіх сем'яў у сталіцы летась было накіравана больш як 51,2 млрд беларускіх рублёў.

## ЗА КОЛЬКАСЦЬ І ЯКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА

Новая нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі будзе распрацавана ў 2015 годзе

**Паводле слоў міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны ШЧОТКІНАЙ, камітэтам па працы, занятасці і сацабароне аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама неабходна актыўна ўключацца ў працэс яе распрацоўкі.**

«Сканцэнтруйце намаганні на маніторынгу і ацэнцы дэмаграфічнай сітуацыі канкрэтна на месцах, фарміруйце падыходы да вырашэння дэмаграфічных пытанняў з улікам асаблівасцяў кожнага рэгіёна. Не дапускайце механічнага кланіравання праграм», — паставіла задачу міністр.

Яна праінфармавала, што канцэпцыя трэцяй Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2016-2020 гады ўжо распрацавана і ўзгоднена з зацікаўленымі ведамствамі. Гэта работа праводзіцца ў цесным супрацоўніцтве, перш за ўсё, з міністэрствамі аховы здароўя, адукацыі, унутраных спраў.

**БЕЛТА** ■

■ У вас будзе дзіця

«ЗВЯЗДА» + АНТ

***«Будзьце шчаслівыя разам!»** — заклікае Людміла Бусько, вядучая адной з самых добрых тэлевізійных рубрык, што вось ужо чацвёрты год выходзіць на тэлеканале АНТ (у рамках праграмы «Пакуль усе дома», а з нядаўняга часу — і ў пятнічных выпусках праграмы «Наша раніца»). Стваральнікі беларуска-расійскага праекта дапамагаюць дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі, любові і клопату, адшукаць новыя сем'і. За гэты час ужо 54 з іх аказаліся ў сем'ях.*

## Каб усе трапілі дадому



**«Звязда», якая летась таксама далучылася да праекта, працягвае знаёміць чытачоў з малымі, якія мараць знайсці бацькоўскую пяшчоту і ўтульны дом. Сёння раскажам вам пра 7-гадовую Вераніку, якая выхоўваецца ў Кобрынскім дзіцячым доме.**

Вераніка расце з асаблівасцямі ў развіцці, яна гіперактыўная, а значыць, ёй больш за каго іншага патрэбны ўвага, любоў і клопат. "Яна ў нас такі жэўжык — рухавая, вельмі актыўная, ёй цяжка ўседзець на адным месцы, таму мы стараемся прывучаць Вераніку да спорту. Яна з вялікім задавальненнем круціць абруч, займаецца са скакалкай, лепш за ўсіх дзяцей бегае і скача», — распавядаюць пра дзяўчынку выхавальнікі.

Зразумела, яе патэнцыйным бацькам вялікі запас цярпення спатрэбіцца, бо з-за празмернай актыўнасці і няўмення надоўга засяродзіцца многія рэчы дзяўчынцы даводзіцца тлумачыць шмат разоў — але хіба з дзецьмі наогул бывае ўсё проста і адразу? І хіба вераґодныя цяжкасці палохаюць тых, чыёй душэўнай цеплыні хопіць на тое, каб сагрэць яшчэ адно маленькае дзіцячае сэрца?

*Калі вы хочаце даведацца пра Вераніку больш, патэлефануйце па нумары: (017) 284-71-51. Гэта тэлефон Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.*

## Надзея МІКУЛІЧ:

# «...ЯМУ І ПРЫСВЯЧАЮ ШЛЯГЕР!»

**Яна ўваходзіць у пакой — і ў ім быццам робіцца святлей. Вялікая, шумлівая, вясёлая — жывы і моцны зарад пазітыўнай энергіі. Калі ж я называю яе зубрам беларускай эстрады, не крыўдзіцца — толькі смяецца і папраўляе мяне: «Зубрыха!..» Сапраўды, на сцэну спявачка Надзея МІКУЛІЧ выйшла больш за 40 гадоў таму і сваю творчую дзейнасць пачынала ў славутых сёння ансамблях «Чараўніцы» і «Верасы». У яе багажы — сотні канцэртаў, званне заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь і... 40 гадоў сямейнага стажу з Барысам Белым. Зразумела, што пэўнай часткай поспеху артыстка абавязана мужу. «Падтрымкай было ўжо тое, што ён дазваляў мне працаваць там, дзе я хачу», — гаворыць Надзея.**



## «ГЭКАЛА» ТАК, ШТО ЎСЕ СМЯЯЛІСЯ

...Родам яна з Гродзенскай вобласці, нарадзілася ў пасёлку цукровага завода ў Скідзельскім раёне. У пашпарце так і запісана: «Цукровы завод». Калі Надзеі было 3 гады, сям'я пераехала ў Данецк — бацька пасля арміі ўладкаваўся там на працу ў шахце. У Данецку Надзея скончыла 2 класы, з другога вучыла ўкраінскую мову. Калі вярнуліся ў Беларусь, яна так «гэкала», што ўсе смяяліся...

У школьныя гады Надзея наведвала музычную студыю ў Клубе будаўнікоў. Заняткі музыкай дзяўчынка выбрала невыпадкова: у іх сям'і ўсе любілі спяваць. Праўда, бацька спяваў гучна, але мелодыю песні было не пазнаць. Затое маці спявала вельмі прыгожа і дачку вучыла з маленства ўсім тым народным песням, якія ведала сама. А пасля восьмага класа Надзея паступіла ў музычнае вучылішча.

*— У мяне быў маленькі акардэон, вельмі прыгожы, але з тугімі клавішамі. І я быццам захварэла: увесь час хадзіла ў музычны салон — проста палюбавацца на інструменты. Потым, калі паступіла ў вучылішча і там былі акардэоны, мне захацелася мець свой. І тата купіў мне яго — вялікі!*

У Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы яна, акардэаністка, навучылася іграць на гітары і стварыла жаночы ансамбль. На танцавальных вечарынах, калі музыканты-мужчыны адыходзілі на перакур, дзяўчаты бралі ў рукі іх інструменты і выконвалі папулярныя песні. Аднойчы да іх на танцы прыйшла дзяўчына, якая спявала ў ансамблі «Чараўніцы», толькі што створаным пры гродзенскім Палацы тэкстыльшчыкаў. Яна паслухала, як іграюць і спяваюць дзяўчаты, і запрасіла Надзею на рэпетыцыю «Чараўніц»: «Прыйдзі, пагляндзі!..»

*— Вядома, я туды пайшла, і мне так спадабалася!.. Кіраўнік «Чараўніц», Генадзь Латынскі, узяў мяне ў калектыў, але «пасадзіў» на клавішы. Я кажу: «Мне б клавішы перавярнуць, як акардэон, — сыграла б, а так у мяне не атрымліваецца». А ён: «Добра, давай я цябе на бас-гітары навучу!..» І навучыў, я на бас-гітары іграла, а часам — на шасціструнцы-рытм. І тут да нас, у Гродна, на гастролі (а гэта быў 1971 год) прыехалі заслужаны артыст рэспублікі Эдуард Міцуль і ансамбль «Верасы», які ў той час быў жаночым калектывам. Таму нашы «Чараўніцы» пайшлі паглядзець «Верасоў». А ім якраз патрэбна была дзяўчына, якая іграе і спявае. І вось ужо «Верасы» прыйшлі да нас на рэпетыцыю ў Палац тэкстыльшчыкаў — праслухаць. Я паказала ўсё, што ўмела, — і спадабалася ім! Адправілі цэлую дэлегацыю да маіх бацькоў — прасіць адпусціць мяне ў Мінск.*

А бацькі катэгарычна выказаліся супраць: «Скончы вучылішча, тады — калі ласка!..»

## НЕ ЎЯЎЛЯЛІ, ШТО БУДЗЕМ «ЗОРКАМІ»

«Верасы» чакалі яе год, а Надзея вучылася і пастаянна думала: «А раптам яны каго-небудзь знойдуць, і ўсё — дарога мне будзе закрыта!» Але на працягу ўсяго года яна неаднойчы наведвалася ў філармонію — ездзіла на праслухоўванне. Бо адна справа, калі цябе ўдзельнікі ансамбля паслухаюць, а другая — начальства і мастацкая рада...

*— Калі я прыехала ў Мінск ужо ўладкоўвацца на працу, мяне ўзялі ў «Верасы». І хутка — на гастролі! Дарэчы, праз год і ансамбль «Чараўніцы» забралі ў філармонію, у Мінск. Гэта значыць, каб я не трапіла ў «Верасы», усё роўна апынулася б у філармоніі... Хаця невядома, як бы склаўся мой творчы лёс: у «Верасах» я была спявачка, часам іграла на бас-гітары ці проста на гітары, а ў «Чараўніцах» кіраўнік бачыў мяне толькі як бас-гітарыстку.*

Тады, у 1970-я гады, ніхто з удзельнікаў ансамбля навет уявіць сабе не мог, што іх калектыў праз нейкі час стане «зорным» і назаўжды ўвойдзе ў гісторыю беларускай эстрады. Яны проста працавалі. Шмат працавалі...

*— Ад'язджаем на гастролі: жывём у гатэлі, раніцай снедаем і збіраемся на рэпетыцыю. Потым трохі адпачылі — на канцэрт! Перад канцэртам спяваем, у цягніку спяваем, рэпеціруем, ноты пішам. Не так, як сёння, а ўсё на слых. У Ядзі Паплаўскай абсалютны слых, яна не цярпіць фальшы і ўсё чуе, і не толькі ў музыцы. Былі моманты, калі ў калектыве навісала напружаная атмасфера: дзесьці хтосьці штосьці сказаў ці, наадварот, не сказаў. Ядзя імгненна збірала ўсіх: «Гаварыце ў вочы, што каму не падабаецца!» Пагаворым, пакрычым, пасваримся — усё, канфлікт зняты.*



«Верасы» чакалі яе год.

З будучым мужам, Барысам Белым, яна сустрэлася таксама ў філармоніі, на рэпетыцыі «Верасоў». Так што гэты ансамбль стаў па-сапраўднаму лёсавызначальным для яе.

*— Бора прыйшоў да нас пабочым сцэны. Мы рэпеціравалі, спявалі, тут ён зайшоў у залу у белым плашчы. Потым мы сталі пасля рэпетыцый хадзіць у кіно. Я старалася сесці побач з ім: калі побач сяджу — значыць, ён мяне праўдзе дадому. Перад тым, як пажаніцца, мы паўтара года проста сустракаліся. Потым ужо жылі разам, але тады так не было заведзена. Нас з Ядзяй выклікалі да начальства: Ядзя з Сашам сустракалася, а я — з Борам. Хлопцы нас чакалі за дзвярамі, а мы атрымлівалі наганяй. Далей Бора пайшоў на павышэнне: паехаў на стажыроўку, стаў адміністратарам, а потым — дырэктарам ансамбля «Чараўніцы»...*

## МУЖ ПАЗЫЧЫЎ ПІНЖАК У ЦІХАНОВІЧА

Жаніхаліся гэтыя дзве вядомыя сёння пары адначасова і пажаніліся таксама амаль адначасова. І нават вяселлі жаніхі згулялі... у адным і тым жа пінжаку.

*— З вяселлем цікава атрымалася. Раней, працуючы ў філармоніі, можна было лёгка кватэру ў кааператыве пабудаваць. Уяўляеце, дырэктар за намі хадзіў і ўгаворваў: «Дзяўчаты, падавайце заяву на кватэру, пакуль ёсць магчымасць!» Думаю: калі я незамужам, то можна толькі аднапакаёвую, а калі ўзяць шлюб — двухпакаёвую. Тэлефаную Бору на гастролі і кажу, што прыеду да яго замуж выходзіць. Мы ў Мінску хацелі распісацца, але тут трэба было месяц чакаць, а нам раптам прыспічыла. Прыехала да яго ў Івацэвічы, і з сяброўкай, сведкай, пайшлі ў ЗАГС. Сядзелі там дзве гадзіны, а нам кажуць: «Нельга! Распісвацца трэба або там, дзе вы прапісаны, або там, дзе бацькі». А Бора — родам з пасёлка Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна, недалёка, у прынцыпе, ад Івацэвіч... Паехалі мы да яго на радзіму. Ён мяне з бацькамі пазнаёміў, а то яны наогул не ведалі, што ў Барыса дзяўчына ёсць. Мяне пакінуў дома, а сам паехаў у сельсавет дамаўляцца. І прыехаў ужо з пасведчаннем аб шлюбе!*

*Вяселле таксама было... вясёлае. Бора проста з гастроляў прыехаў да мяне ў Гродна. Яго радня — уся ў вёсцы. Мая радня сабралася ў 12.00, і мы чакаем, калі госці жаніха прыедуць... Мая мама ўжо плакаць стала: сталы накрытыя, усе сядзяць галодныя і чакаюць, а іх няма! Прыехалі, калі цямнець пачало...*

*На вяселле Бора ўзяў у Сашы Ціхановіча прыгожы крымпленавы пінжак — свайго не было. А потым Сашка жаніўся таксама ў гэтым пінжаку. Атрымліваецца, шчаслівы пінжак быў: і ў нас, і ў Сашы з Ядзяй моцныя шлюбы аказаліся.*

Пажаніліся яны ў 1974 годзе, а дачушку нарадзілі толькі ў 1980-м. Гэта быў зорны час «Верасоў», і таму Надзея ўсё адкладвала гэтую важную падзею.

*— Не хацела, прасіла мужа пачакаць. А ён, калі бачыў, якія з зрывала апладысменты, калі адна спявала пад гітару, казаў: «Ты ж — гатовая спявачка! Давай, рабі сваю праграму і ідзі ў свабоднае плаванне!» Я ніяк не магла адважыцца. Адважыўся ён, і мне давялося пайсці... у дэкрэтны водпуск.*

*У вакальна-інструментальным ансамблі «Верасы» Надзея Мікуліч адпрацавала 8 гадоў. А пасля дэкрэту яе туды ўжо не ўзялі...*

## ЯК Я ЗГУБЛЮСЯ? Я ГЭТЫМ ЖЫВУ!..

Яна занялася сольнай творчасцю. Аказалася, не такая гэта лёгкая справа — сумяшчаць кар'еру спявачкі і мацярынства. Вядома, дапамагалі бацькі, і заўсёды, калі толькі мог, сваё надзейнае плячо падстаўляў муж. І Надзея Мікуліч не згубілася ў эстрадным свеце, захавала сваю папулярнасць і нават атрымала ганаровае званне.

*— Да школы мы пакідалі Волю ў бабуль — то ў маці Боры, то ў маёй. Прыеду з гастроляў і адразу — да дачкі! А яна мяне цёткай называе! Я ў слёзы!.. Потым ужо прывыкне, зноў мамай заве.*

*У 1983-м я стала дыпламантам Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады, і мне дазволілі працаваць сольна аддзяленне. Я стала працаваць з калектывам, ансамблем сучаснага танца. А спявала я толькі пад гітару. Потым выступала разам з ансамблем «Сузор'е» — памятаеце такі гурт? Яны ігралі ўсё маё аддзяленне. Валодзя Пузыня, вядомы майстар, зрабіў для нас дудкі, іншыя беларускія нацыянальныя інструменты. Прымалі цудоўна — амаль усё ішло «на біс».*

*Потым я стварыла свой калектыў: гітарыст Аляксандр Ляднёў, балетная пара Наталля Кастрама і Вячаслаў Лісненскі, вядучы Віталь Жукаў, але пазней нас «ператасавалі» з іншым калектывам. Перабудова ішла... Апошні раз, калі мы паехалі на гастролі, нічога не зарабілі і ашчэ засталіся вінаватыя грошы. На той момант я ўжо 21 год адпрацавала ў філармоніі і, як вакалістка, пасля 20 гадоў выступленняў магла выйсці на пенсію. Што і зрабіла ў 1993 годзе...*

*А калі выйшла на пенсію, стала больш працаваць, выпусціла 4 дыскі — столькі новых песень з'явілася ў рэпертуары, столькі магчымасцяў і свабоды! І ўжо тады атрымала званне заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь. Сёння ў мяне канцэрты — ад выпадку да выпадку, усяго па адным на месяц. Але як я магу згубіцца, калі гэтым жыву?*

## «МОЖНА ДА ВАС ДАКРАНУЦЦА?»

Сённяшні слухач ужо амаль не асацыюе Надзею Мікуліч з ансамблем «Верасы», а ведае і любіць за песні з яе сольнага рэпертуару, якія яна карпатліва збірала, дарэчы, на працягу многіх гадоў і вельмі шкадуе з кожнай развітваца...

*— З «Верасоў» я пайшла з адной песняй, астатнія спяваць не магла: яны не гітарныя. Другая песня ў мой рэпертуар прыйшла, калі да нас прыехалі на гастролі Жанна Раждзественская і ансамбль «Пламя». Жанна іграла на раялі і спявала «Ни слова не скажу тебе», і я падумала: «Вось мая песня!» Падышла да яе пасля канцэрта, і яна аддала мне гэтую песню! А пасля Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады ў мяне з'явіліся песні «Авэ, Марыя!» Эдуарда Зарыцкага і «Ксеня» Уладзіміра Будніка. Цудоўныя песні напісалі для мяне кампазітары: Валерый Іваноў — «Прадчуванне вечнасці», Яўген Глебаў — «Калыханку», Эдуард Зарыцкі — «Я вярнуся»...*

Адна з самых папулярных і любімых слухачамі песень у выкананні Надзеі Мікуліч — «Ой, бяда, бяда!..» На канцэртах яна заўсёды ідзе «на біс». І кожны раз перад яе выкананнем Надзея не забывае сказаць, што гэты твор яна прысвячае свайму любімаму мужу.

*— Мяне доўга «даставаў» паэт Яўген Бароўскі: калі я ўжо штосьці напішу, бо ён мне свае вершы даў. А я якраз тады ў Гомель з канцэртам ездзіла. Было шмат часу да цягніка, думаю: пакуль сяджу, пачытаю іх. І атрымалася музыка! Мне спадабалася... Муж мяне павінен быў сустрэць. Я прыязджаю ў Мінск — ніхто не сустракае! Дабіраюся сама дадому, а там ужо стол накрыты і распачатае ўсё, але нікога няма. Услед за мной прыязджае мой Барыс Пятровіч з сябрам, ужо «вясёленькія»: «Вой, а мы цябе сустракалі!» Я кажу: «Добра, зараз я вам песню пакажу!» Праспявала, а Бора: «Гэта будзе шлягер!» А я сказала, што яму і прысвячаю шлягер...*

Напрыканцы мінулага года Надзея Мікуліч і Барыс Белы адсвяткавалі рубінавае вяселле — 40 гадоў сумеснага жыцця. У кавярні прысутнічалі самыя блізкія і родныя ім людзі.

Яна па-ранейшаму запатрабаваная і любімая сваімі прыхільнікамі. Людзі на вуліцы яе пазнаюць: і кветкі дораць, і рукі цалуюць, і словы любові і прызнання выказваюць. І нават могуць проста падысці і спытаць: «Можна да вас дакрануцца?»...

**Тамара БУНТА.**

Надзея МІКУЛІЧ з мужам Барысам БЕЛЫМ і дачкой Вольгай падчас святкавання 40-годдзя вяселля, 2014 г.



# Бяспечнай дарогі, малы!

## Выбіраем аўтакрэсла для дзіцяці



**Сёння ўсе бацькі павінны памятаць, што аўтакрэсла для малога ў машыне — абавязковая рэч. Толькі спецыяльныя дзіцячыя крэслы здольныя выратаваць маленькіх пасажыраў у выпадку аварыі. Ды што там аварыя! Часам трагедыя адбываецца нават пры рэзкім тармажэнні — дзіця проста вылятае з рук маці і з усёй моцы ўразаецца ў лабавое шкло ці пярэдняе крэсла. Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, выкарыстанне дзіцячага аўтамабільнага крэсла зніжае смяротнасць сярод дзяцей да 1 года ў аварыях адразу на 70%! А сярод дзяцей ва ўзросце 1–4 гадоў — на 54%.**

З 16 студзеня 2015 года ў Беларусі ўступіў у сілу Указ № 483, які ўнёс змены і дапаўненні ў Правілы дарожнага руху. Так, «вадзіцелі абавязаны перавозіць дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў у легкавым аўтамабілі з выкарыстаннем дзіцячых утрымліваючых прылад ці іншых сродкаў, якія дазваляюць бяспечна прышпіліць дзіця з дапамогай рамянёў бяспекі (акрамя выпадкаў, калі рост дзіцяці перавышае 150 см, а таксама пры перавозцы ў аўтамабілі-таксі)».

### КЛАСІФІКАЦЫЯ

Усе дзіцячыя аўтакрэслы і іх канструкцыя павінны адпавядаць Еўрапейскаму стандарту бяспекі ECE R44/03 Universal. Паводле Еўрапейскай класіфікацыі, усе дзіцячыя аўтакрэслы падзяляюцца на пяць груп, у залежнасці ад вагі дзіцяці.

**Катэгорыя 0:** Нованароджаных да 1 года, вагой не большай за 10 кг, якія яшчэ не могуць самастойна сядзець, рэкамендуецца перавозіць толькі ў аўталюльцы, дзе яны размяшчаюцца лежачы. Аўталюлькі — гэта тыя ж люлькі ад калысак, але з магчымасцю замацавання на заднім сядзенні аўтамабіля пры дапамозе адмысловых рамянёў. Дзіця фіксуецца ў люльцы шырокім і мяккім рэменем, а вакол галавы немаўля размяшчаецца дадатковая ахова.

***Важна. Пры ўстаноўцы аўтакрэсла не размяшчайце немаўля галавой да дзвярэй!***

**Катэгорыя 0+:** Гэтыя аўтакрэслы для дзяцей да 1,5 года і вагой не большай за 13 кг усталёўваюцца тварам супраць ходу руху на пярэднім або заднім сядзенні — пры такім размяшчэнні немаўля лягчэй пераносіць лабавы ўдар аўтамабіля. Крэслы гэтай групы, як правіла, універсальныя і могуць выкарыстоўвацца як пераноска, качалка, проста крэселка і як люлька для калыскі.

***Важна. Пры ўстаноўцы на пярэднім сядзенні аўтамабіля абавязкова адключайце франтальную падушку бяспекі!***

**Катэгорыя 1:** Гэтыя крэслы для дзяцей ад 1 да 4 гадоў і вагой ад 9 да 18 кг, як правіла, маюць некалькі палажэнняў вугла нахілу (для няспання і сну). Усталёўваюцца, у большасці выпадкаў, па ходзе руху на заднім сядзенні.




**Катэгорыя 2/3:** Для дзяцей ад 3 да 7 гадоў і вагой ад 15 да 25 кг выпускаюцца крэслы, якія прадугледжваюць па меры росту дзіцяці пераход ад выкарыстання ўнутраных рамянёў да вонкавых, аўтамабільных. З ростам дзіцяці спінку такога аўтакрэсла можна зняць, пакінуўшы толькі сядзенне. Усталёўваюцца выключна па ходзе руху на заднім сядзенні.

Для дзяцей вагой 22–36 кг можна выбраць дзіцячае аўтакрэсла групы 3. Гэта так званы **«бустар»** — сядзенне без спінкі. Як правіла, іх выкарыстоўваюць, калі дзіця ўжо досыць высокае. Перавага бустара — нізкая цана. Аднак большасць экспертаў схіляюцца да таго, што яго выкарыстанне непажаданае: ён не мае бакавой аховы. Крэслы групы 2/3 у любым выпадку маюць больш пераваг.

Выпускаюцца таксама ўніверсальныя аўтакрэслы-трансформеры, прыдатныя для некалькіх груп дзяцей (1, 2, 3). Яны больш практычныя, іх хопіць на доўгі тэрмін, але па бяспецы яны значна саступаюць «вузкаспецыялізаваным» крэслам.

### Выбіраючы дзіцячае аўтакрэсла, зыходзьце з наступнага

▸ Дзіцячае аўтакрэсла перш за ўсё павінна ў выпадку аварыі забяспечыць малому максімальную абарону. Самыя бяспечныя аўтакрэслы выпускаюць еўрапейскія вытворцы Romer, Bebe-Confort, Maxi-Cosi, Recaro, Kiddy, Cybex, Britax, Concord, Jane, Chicco.

▸ Група аўтакрэсла павінна адпавядаць вазе маленькага пасажыра, таму перад наведваннем крамы абавязкова ўзважце сваё дзіця.

▸ У аўтакрэсле дзіцяці павінна быць камфортна. Зручнасць тут з'яўляецца элементам пасіўнай бяспекі, бо ў няўзручным крэсле дзіця пачне капрызіць і адцягваць увагу кіроўцы ад дарогі. Таму перад купляй дазвольце малому «прымераць» крэсла, у якім яму трэба будзе правесці шмат часу.

▸ Чым меншае дзіця, тым важней для яго магчымасць спаць падчас паездкі, таму пажадана, каб крэсла рэгулявалася па нахіле.

▸ Для дзяцей да 3 гадоў абавязковыя ўнутраныя Y-падобныя або пяцікропкавыя рамяні, бо толькі яны змогуць засцерагчы малое ад характэрных пашкоджанняў брушной поласці і траўмы пазваночніка.

▸ У аўтакрэслах з унутранымі рамянямі бяспекі звярніце ўвагу ў пракладку ў замку-спражцы, якая злучае рамяні ў зоне пахвіны дзіцяці. Пры франтальным удары на гэтае месца прыйдуцца значныя нагрузкі і пракладка павінна быць досыць шырокай і пругкай, каб не траўмаваць малога.

▸ Дзіцячае аўтакрэсла павінна без праблем пераносіцца і проста ставіцца ў ваш аўтамабіль усімі, хто будзе вазіць малое. Неабходна прымераць аўтакрэсла ў сваю машыну.

▸ Пры падарожжах за мяжой памятайце — у шэрагу краін спераду можна перавозіць толькі люлькі для самых маленькіх.

### ISOFIX ЦІ НЕ?

Часам пры падборы дзіцячага аўтакрэсла паўстае пытанне — купляць з мацаваннямі Isofix ці не. Isofix — гэта сістэма мацавання крэслаў пры дапамозе клямараў, якія схаваны паміж падушкай і спінкай задняга сядзення аўтамабіля (таму для пачатку праверце, ці ёсць Isofix у вашай машыне). Яны, як правіла, даражэйшыя, аднак эксперты раяць не эканоміць (наяўнасць Isofix не перашкаджае пры неабходнасці прышпільваць крэсла стандартнымі рамянямі). Усе краш-тэсты паказваюць, што дзіцячыя аўтакрэслы з сістэмай Isofix адчувальна больш бяспечныя, ды і мацаваць іх прасцей. Звычайна ў аўтамабілі мацаваннем Isofix абсталёўваюцца два крайнія заднія месцы (шэраг мадэляў маюць мацаванні на ўсіх пасажырскіх сядзеннях).



Часта дзіцячыя аўтакрэслы «пачатковых» груп, акрамя сістэмы мацавання Isofix, валодаюць і дадатковымі мацаваннямі. Гэта альбо ўпор у падлогу салона аўтамабіля, альбо мацаванне Top Tether (якарны рэмень). Праўда, не ўсе аўтамабілі маюць крапяжы для яго выкарыстання.

---

■ Майстар-клас

# «ГАЛОЎНАЕ, КАБ КАСЦЮМЧЫК СЯДЗЕЎ!»

**Як кожная сапраўдная лэдзі не можа абысціся без маленькай чорнай сукенкі, так і абавязковым складнікам мужчынскага гардэроба з'яўляецца касцюм. Строгі і кансерватыўны англійскі, камфортны амерыканскі ці элегантны еўрапейскі — не важна, якому тыпу гарнітура вы аддасце перавагу, галоўнае, каб ён выдатна сядзеў па фігуры і быў зручны. Як жа правільна падабраць касцюм?**

Звычайна ў продажы бываюць наступныя мадэлі:

***1. Аднабортны*** (з гузікамі на адным баку і прарэзкамі на другім). Гэты пакрой з'яўляецца самым распаўсюджаным і адначасова самым універсальным. Яго выбіраюць 80% мужчын. Адной з самых галоўных пераваг аднабортнага пакрою можна назваць лёгкасць у эксплуатацыі: адной рукой можна расшпіліць/зашпіліць пінжак, чаго не зробіш з двухбортнай мадэллю.

***2. Двухбортны*** (з гузікамі і прарэзкамі на кожным крысе). Двухбортны фасон больш экстравагантны. Ён заўсёды мае два бакавыя разрэзы на пінжаку і ніколі ззаду.

***3. Касцюм-тройка.*** Пінжак у такіх мадэлях аднабортны, і пад яго на сарочку надзяваецца камізэлька.

### Зазірніце ў люстэрка

Пры выбары гарнітура ў першую чаргу неабходна ўлічваць асаблівасці свайго целаскладу. Так, высокім мужчынам, якія хацелі б зрокава паменшыць рост, трэба пазбягаць любых вертыкальных палосак і ліній. Пінжак выбірайце добрага крою, з простым і выразным сілуэтам. Двухбортны пінжак ці пінжак з трыма гузікамі — не самы добры для вас варыянт. Лепш звярніце ўвагу на мадэлі з двума гузікамі, накладнымі кішэнямі і шырокімі штрыфелямі — так вы прыдасце «аб'ём» сваёй фігуры. Штаны падбірайце са складкамі і крыху завужаныя знізу.

Невысокім мужчынам не варта набываць двухбортных пінжак, пінжак падоўжанай мадэлі ці ў буйную клетку. Ваш варыянт — штаны з крыху завышанай таліяй, без адваротаў, са стрэлкамі, і пінжак, які прыкрывае ягадзіцы.

Поўным мужчынам, наадварот, рэкамендуюцца касцюмы ў вертыкальную палоску — гэта дапамажа схаваць паўнату і трохі выцягнуць рост. Мадэль павінна адцягваць увагу ад таліі і падкрэсліваць лінію плячэй. Не набывайце гарнітуры з накладнымі кішэнямі і шырокімі штрыфелямі. Двухбортныя пінжакі будуць падкрэсліваць вагу — лепш спыніце ўвагу на варыянце з трыма гузікамі. Штаны павінны быць прамымі, свабоднымі і без адваротаў.

### Колер — усяму галава!

Колер касцюма перадае шмат інфармацыі пра яго ўладальніка. Калі жадаеце зрабіць уражанне моцнага і ўпэўненага мужчыны, выбірайце гарнітур сіняга ці шэрага колеру.

***Сіні*** касцюм асацыюецца з чалавекам-прафесіяналам, лідарам, які аддае перавагу аўтарытарнаму стылю кіравання.

Уладальніка касцюма ***шэрага*** колеру вылучае кансерватызм, стабільнасць, годнасць і прафесіяналізм. Памятайце, што чым цямнейшы колер вы выбіраеце, тым ярчэй праяўляюцца гэтыя якасці для тых, хто вас акружае.

Гарнітуры шэрых тонаў і адценняў псіхолагі раяць насіць кожны дзень, касцюмы сіняга колеру лічацца ўніверсальнымі, на ўсе выпадкі жыцця, чорны колер варта апранаць толькі ў асаблівых выпадках.

Крыху пра спалучэнні колераў. Мода сёння дазваляе камбінаваць штаны і пінжакі рознага колеру, але пры гэтым неабходна прытрымлівацца наступных правілаў:

♦ Да пінжака ў клетку ці палоску падбірайце аднатонныя штаны.

♦ Калі штаны ў палоску ці клетку, набывайце толькі аднатонны пінжак.

♦ Колеры штаноў і пінжака абавязкова павінны спалучацца адзін з адным.

♦ Кантрастныя колеры пасуюць больш маладым людзям, мужчынам старэйшага ўзросту варта спыніць свой выбар на прыглушаных, спакойных спалучэннях колераў.

### Па адзенні сустракаюць

Галоўная ўмова выбару добрага касцюма — ён павінен ідэальна пасаваць вашай фігуры. Заўсёды пачынайце прымерку з пінжака.

Звярніце пільную ўвагу на плечы і спіну. У плячах пінжак мусіць сядзець быццам уліты, але пры гэтым не павінна адчувацца ніякай скаванасці. Каўнер мякка абцякае шыю, а штрыфелі ў верхняй частцы пінжака ідэальна прылягаюць да барту. Агледзьце сябе са спіны: паміж лапаткамі, нават калі выцягнуць рукі ўперад, не павінна быць ні складак, ні зморшчын. Калі вы выбіраеце класічны варыянт, то памятайце, што ніжні край пінжака мусіць прыкрываць ягадзіцы. Кароткі пінжак зрокава зробіць мужчыну ніжэйшым ростам. І яшчэ праверце, каб ніз пінжака быў паралельным падлозе.

Як вызначыць правільную даўжыню рукава? Калі рукаў пінжака закрывае сарочку, значыць, ён занадта доўгі. Даўжыня рукава павінна быць карацейшай за манжэт сарочкі на 1–1,5 см. Вызначыць патрэбную даўжыню можна наступным чынам: выцягніце рукі ўздоўж цела, затым адагніце вялікі палец на 90 градусаў. На тым месцы, дзе ўтвараецца вугал, і ёсць ваша даўжыня.

### Выбіраем штаны

Касцюм з занадта доўгімі штанамі выглядае неакуратна. Абавязковая ўмова пры выбары штаноў — яны прыкрываюць шкарпэткі, а шкарпэткі мусяць быць такімі доўгімі, каб не агаляць ногі, калі вы сядзіце. Даўжыня правільна падабраных штаноў ззаду заканчваецца пасярэдзіне абцаса чаравіка, а спераду яны трохі прыкрываюць шнуроўку і ўтвараюць адну невялікую складку.



### Важныя дробязі

***1. Не надзявайце сарочку з кароткім рукавом з гальштукам.***

2. Старанна выбірайце туфлі. Пры ўдалым спалучэнні з касцюмам яны ствараць стыльны і дзелавы выгляд.

***3. Набывайце шкарпэткі пад колер штаноў (у крайнім выпадку — на тон святлейшыя). Ніколі не надзявайце разам з дзелавым касцюмам шкарпэткі з малюнкам, нават калі ён вельмі дробны.***

4. Папруга павінна адпавядаць па колеры абутку (ці быць на тон цямнейшай, але ніколі святлейшай за чаравікі).

***5. Даўжыня гальштука павінна даходзіць да лініі пояса. Пры правільна завязаным гальштуку з'яўляецца невялікая ўпадзіна ў цэнтры.***

6. Самы ніжні гузік пінжака звычайна не зашпільваецца.

***7. Не трымайце ніякіх ручак, кашалькоў і іншай драбязы ў нагрудной кішэні. Максімум — насоўку.***

8. Шліцы пінжака не павінны разыходзіцца.

■ Ліст у рэдакцыю

# ПРЫРУЧЫЎ — АДКАЗВАЙ,

## або Хто павінен займацца жывёламі, якія згубіліся

**Праблема жорсткага абыходжання з жывёламі застаецца вострай і знаходзіць свой водгук у грамадстве. Пра гэта сведчаць і крокі, якія робяцца для яе вырашэння на дзяржаўным узроўні (уступленне ў дзеянне новых артыкулаў Крымінальнага кодэкса, распрацоўка адпаведнага закона), і звароты саміх грамадзян. Адзін з такіх лістоў прыйшоў у рэдакцыю «Звязды» ад мінчанкі Настассі, якая — па форме — выказвае крыўду ў адрас жывёлаахоўнай арганізацыі «Эгіда», а па сутнасці — абурэнне безадказнымі ў дачыненні да братоў нашых меншых паводзінамі людзей.**



«З тых часоў, як у Мінску з'явілася гэтая арганізацыя, я захаплялася самаадданасцю яе ўдзельнікаў: не шкадуючы сябе, яны дапамагавала тым жывёлкам, якім не пашанцавала з гаспадарамі», — пачынае свой ліст Настасся. Аднак пасля піша, што «дыфірамбы скончаны».

**Статыстыка, якую паведамілі ў «Фаўне горада», засмучае: толькі за мінулы год ад насельніцтва на прадпрыемства паступілі 771 сабака і 1014 катоў. Палову з іх складаюць гадаванцы, якіх грамадзяне здаюць добраахвотна...**

«Калі вярталіся з прагулкі з гадавалым дзіцем, на стадыёне школы (Прытыцкага, 88) я ўбачыла шчанюка 4-5 месяцаў. Руды, пацешны, вушкі вісяць, гуллівы, але вельмі галодны. Сабачка «даваў лапу», а добрыя дзеткі яго «частавалі» снежкамі і ледзяшамі, якія той прагна грыз. Высветліўшы, што сабака нічый, я пачала тэлефанаваць у даведку, каб знайсці нумар тэлефона «Эгіды». А потым на працягу гадзіны спрабавала датэлефанавацца па тых тэлефонах, якія мне далі ў даведцы...»

Калі Настасся нарэшце дазванілася, то распавяла валанцёру пра тое, што знайшла шчаня і што ўзяць да сябе яго не можа, бо дома — дарослы сабака, які не прыме іншую жывёлу на сваёй тэрыторыі. Жанчына чакала, што хтосьці з валанцёраў пад'едзе альбо ёй дадуць кантакты кагосьці з іх у яе раёне. Аднак ёй адказалі наступнае: «Зайдзіце на сайт egida.by, стварыце там тэму. Напішыце аб'яву, можа, хто і адгукнецца».

Настасся паспрабавала растлумачыць дзяўчыне, што пакуль яна будзе хадзіць і «займацца піярам» сабачкі, шчанюк можа куды-небудзь пайсці. Яшчэ раз папрасіла, каб хто-небудзь прыехаў і дапамог...

Маладая маці амаль гадзіну вартавала сабаку на стадыёне. Прасіла кожнага мінака пабыць са шчанюком, каб ёй можна было аднесці дзіця дадому і выйсці з вольнымі рукамі — занядта лёсам шчанюка. Але ніхто так і не дапамог. У выніку яна папрасіла дзяцей папільнаваць сабаку, але пакуль збегала дадому і вярнулася, на стадыёне ні дзяцей, ні шчанюка не аказалася. Аббегла наваколле — без выніку.

І ўвесь гэты час жанчына без перапынку набірала тэлефоны «Эгіды».

«Я разумею, што ўсіх жывёл выратаваць немагчыма, — працягвае аўтарка ліста. — Але чаму валанцёры нават не паспрабавалі гэтага зрабіць?! Можа, гэта і блюзнерства, але адна справа — дарослы сабака, і іншая — галоднае маленькае шчаня. Я не кажу, што люблю сабак без памяці, але я гадзіну марозіла на вуліцы сваё дзіця, спрабуючы дапамагчы шчаняці. Ну няма ў мяне ў тэлефоне інтэрнэту, каб прама там, на стадыёне, аб'явы пісаць. Няхай сабе мінакі адмовіліся дапамагчы, але валанцёры, якія распісваюцца ў сваёй любові да жывёл?! Растлумачце, як так можна рабіць. А яшчэ лепш хай самі прадстаўнікі «Эгіды» гэта растлумачаць».

«Звязда» звязалася з жывёлаахоўнай арганізацыяй і папрасіла пракаментаваць сітуацыю.

— Штодня да нас паступае мноства званкоў ад людзей, якія знаходзяць жывёл на вуліцы. Першае, што мы просім, — гэта зрабіць фота знойдзенага гадаванца, — расказвае **старшыня ГААЖ «Эгіда» Вераніка ХАНЦЭВІЧ.** — Спачатку мы праглядаем усю базу, каб даведацца, раптам ён знік і яго шукаюць. Затым на сайце ствараем асобную тэму, прысвечаную знайдышу, апісваем сітуацыю і абставіны знаходжання, даём максімальна падрабязную інфармацыю пра яго, а таксама пішам, што неабходна зрабіць у гэты момант. Па магчымасці выязджаем на месца самі, вязём знойдзенага да ветэрынара і шукаем, хто можа ўзяць яго на перытрымку.

На жаль, людзі не заўсёды разумеюць, што гэта для нас не праца. У кожнага валанцёра ёсць свая праца, вучоба, свае сем'і і жывёлы. Таму калі валанцёр не прыязджае імгненна, гэта не значыць, што ён дрэнны. Да таго ж многія людзі, знайшоўшы жывёлу, імкнуцца перакласці адказнасць за яе на чужыя плечы, гаворачы, што з нейкіх прычын не могуць патрымаць знойдзенага ў сябе пэўны час.

Між тым, апроч валанцёрскіх арганізацый, пры знаходжанні на вуліцы бяздомнай жывёліны можна звярнуцца на дзяржаўнае прадпрыемства «Фаўна горада».

— Ёсць два варыянты: чалавек сам прывозіць жывёлу і плаціць грошы за пяць дзён яго ўтрымання (расцэнкі ўказаны на сайце ў раздзеле «Платныя паслугі»), або, калі бадзяжная жывёла замінае ці ўяўляе небяспеку, яе адлоўліваюць. Для гэтага чалавек павінен звярнуцца ў ЖЭС па месцы жыхарства, — расказалі на прадпрыемстве.

За час знаходжання на прадпрыемстве жывёла праходзіць першасны ветэрынарны агляд, і калі яна здаровая, для яе шукаюць гаспадара, а вось хворых даводзіцца ўсыпляць. Далей, калі ранейшы ўладальнік не знаходзіцца ці адмаўляецца забраць свайго гадаванца, гэта можа зрабіць любы ахвотны. Затым усе неўладкаваныя перадаюцца валанцёрам, якія займаюцца далейшым іх размеркаваннем. Статыстыка, якую паведамілі ў «Фаўне горада», засмучае: толькі за мінулы год ад насельніцтва на прадпрыемства паступілі 771 сабака і 1014 катоў. Палову з іх складаюць гадаванцы, якіх грамадзяне здаюць добраахвотна...

**«У кожнага валанцёра ёсць свая праца, вучоба, свае сем'і і жывёлы. Таму калі валанцёр не прыязджае імгненна, гэта не значыць, што ён дрэнны. Да таго ж многія людзі, знайшоўшы жывёлу, імкнуцца перакласці адказнасць за яе на чужыя плечы».**

Хутчэй за ўсё, у выпадку, пра які расказала Настасся, што называецца, сышліся зоркі. І звяртацца тут трэба не да сумлення валанцёраў, а да нашага, гаспадароў, якія — усім вядома — адказныя за тых, каго прыручылі... Але прапанову ў сваім лісце жанчына агучыла слушную:

«Я гэта ўсё напісала не для таго, каб пакрыўдзіць «Эгіду» як арганізацыю, а каб людзі задумаліся аб стаўленні да жывёл. Можа быць, у кожным раёне стварыць які-небудзь міні-прытулак для такіх выпадкаў? Можа, падаткі, якія плацяць уладальнікі сабак, пойдуць на дапамогу бяздомным жывёлам, а не на зарплату жывадзёрам? Можа, іншыя людзі задумаюцца і як-небудзь дапамогуць галоднаму і кінутаму шчанюку?»

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■

■ Вазьму твой боль...




# ЯК ВЫРАТАВАЦЬ ЦЭЛЫ СВЕТ

**Жыццё навучыла мяне не замахвацца на глабальнае.
Метадам спроб і памылак. Замашак і прамашак.
Гузакоў і ран на сэрцы. Гузакі праходзяць, а раны
не загойваюцца. Але дапамагаюць не атрымаць новых.
Я не вучу вас жыць, а толькі дзялюся сваім досведам.
І ён падказаў мне не замахвацца на глабальнае.
Хочаш змяніць свет — пачні з сябе.**

Гляджу сацыяльную рэкламу ў інтэрнэце — галодныя афрыканскія дзеці з успушанымі жыватамі і кашчавымі каленкамі. Крывёю сэрца абягае. Гатова зараз жа аддаць на іх падтрымку паўзарплаты. Але як гэта зрабіць? Куды перавесці грошы? Каму перадаць правіянт? Пачынаю разведваць, пытаюся ў знаёмых. На што чую адказ: «Ты ж са сваім «Клубам 5000» дапамагаеш анкахворым дзецям. Табе мала?» Мне не мала. Але так шкада няшчасных галодных малых на іншым кантыненце.

Я так і не дапамагла афрыканскім дзецям. Ні тым, што бачыла на фота, ні нейкім іншым. Уначы захварэў мой гадавалы сын. Крык, слёзы, тэмпература. Відаць, рэжуцца зубы. А можа, жывоцік прыхапіла. Ён жа пакуль не ўмее сказаць.

Вось чаго крычаць так усю ноч? Маці не дасць прылегчы. Я тут свет ратую, клапачуся пра галодныя плямёны. Сабралася заўтра адшукаць шляхі да іх. А ты адпачыць не даеш, засяродзіцца. Што твае праблемы ў параўнанні з іхнімі? Ну, зуб лезе — гэта ж добра, яны ва ўсіх лезуць. Ну, з'еў нешта не тое, жывоцік баліць. Думаеш, ад голаду менш баліць?

Мой стомлены голас не супакоіў ні малога, ні мяне саму. Наадварот, павучанні толькі распальвалі плач, а я ўсё больш раздражнялася.

І тут як абухом па галаве — гэта ж твой сын! Яму дрэнна! І што твае пустыя развагі пра невядомых дзяцей, калі не можаш дапамагчы сваёй крывіначцы? Я ўзяла сына на рукі, прыклала да свайго жывата, пагладзіла спінку, заспявала песеньку і самае галоўнае — выкінула з галавы афрыканскіх галадаючых. Я проста была са сваім маленькім сынам — целам, думкамі і душой. Ён супакоіўся і заснуў.

Думай глабальна — дзейнічай лакальна. Гэты прынцып цудоўна апісаны ў кнізе «Тры кубкі гарбаты». Амерыканец Грэг Мортэнсан едзе ў Пакістан будаваць школы, каб змагацца з непісьменнасцю. З самага пачатку ён сутыкаецца з праблемамі: з чаго пачаць, дзе набыць будаўнічыя матэрыялы, як іх перавезці ў цяжкадаступныя раёны, каго наняць на працу і г. д.

Пасля першай перамогі, калі дзякуючы яго неверагодным намаганням з'явілася адна пакістанская школа, ён вырашае рухацца далей — будаваць навучальныя ўстановы па ўсёй тэрыторыі Пакістана і нават у суседніх краінах. І ён зноў у разгубленасці, зноў не ведае, з чаго пачаць. Ён заваяваў давер тут, у маленькай вёсцы Корфэ. Аддаленыя раёны Пакістана, як і іх насельніцтва, варагуюць са сваімі землякамі, ужо не кажучы пра «нявернага» іншаземца. З якога боку да іх падступіцца?

Тады мудры настаўнік Мортэнсана, мясцовы старэйшына Алі сказаў яму: не імкніся туды, дзе нічога не ведаеш. Будуй школы вакол сябе. У суседняй вёсцы, у наступнай...

І адукацыя пачала адзін за адным заваёўваць розныя рэгіёны Пакістана; школы Мортэнсана пранікалі ўсё далей і далей. Паступова. А пасля да яго прыехалі пасланцы з Афганістана, каб прасіць наладзіць асвету і для іх дзяцей.

Калі справа годная, яна сама цябе знойдзе. Рабі вакол сябе. І калі будзе патрэба, калі Бог пажадае, яна стане пашырацца, заваёўваць новыя тэрыторыі, розумы і сэрцы.

Гадоў сем таму, я, ужо вопытная, але наіўная валанцёрка цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, размаўляла пра дабрачынnасць са знаёмай дзяўчынай. Сняжана пераехала жыць у Амерыку і там заснавала фонд. Я не магла ўцяміць, як яна на адлегласці дапамагае беларускім дзецям, як знаходзіць валанцёраў у іншай краіне, як арганізуе акцыі і зборы. Я задавала банальныя пытанні: «А дзе ты бярэш падапечных для свайго фонду?» — «Яны самі знаходзяць нас, прыходзіцца яшчэ адсейваць».

Цяпер я сама разбіраю завалы лістоў з просьбай дапамагчы. Лісты дабрачыннаму руху дапамогі анкахворым дзецям і іх сем'ям "Клуб 5000" прыходзяць з розных краін. Незнаёмыя людзі самі знаходзяць нас. А ўсё таму, што калісьці я пачала дапамагаць тым, хто быў побач, каго бачыла кожны дзень і да чыіх патрэб не засталася абыякавай. Спачатку падключала сваіх знаёмых, потым — знаёмых знаёмых. Далей «сарафаннае радыё» разнесла пагалоску, дапамог інтэрнэт. І тады ўжо ад мяне нічога не залежала. Дзейнічай лакальна — і глабальнае само знойдзе цябе.

...Тэлефануе партнёр «Клуба 5000», які штомесяц пералічвае на карысць нашых падапечных працэнт ад прыбытку сямейнага бізнесу. «Таня, нам прыйдзецца ўрэзаць дапамогу клубу. Прыехалі сваякі з Данецка. Там вайна. Трэба падтрымаць іх тут. Прабачце», — вінавата паведамляе Вольга. А я толькі рада. Рада, што яна ўмее расстаўляць прыярытэты і дзейнічаць лакальна. Бо ў жыцці куды прасцей любіць цэлы свет, чым прымірыцца з суседам. Мы замахваемся на недасяжныя праекты, выношваем нерэальныя ідэі, пакутуем ад неіснуючых праблем і ратуем далёкіх фантомаў. Калі побач нашы блізкія, і ім патрэбна дапамога.

Я актыўна займалася «Клубам 5000», калі мая родная цётка захварэла на рак. Я суцяшала незнаёмых матуль; набівалася ў сябры дзецям, якіх бачыла ўпершыню; збірала тысячы долараў на аперацыю тым, каго не бачыла ніколі. І нават па тэлефоне не ўдзяляла ўвагу цётцы Любе. Толькі аднойчы пагаварыла з ёй — на бягу, як заўсёды. І тады зразумела, як патрэбна ёй проста, каб яе слухалі. Але было ўжо позна. Я ніколі не змагу выправіць гэтую памылку.

Пішу гэты тэкст у гадавіну смерці сваёй цёткі і заклікаю вас: глядзіце побач. І рабіце тое, што ў вашых сілах, тое, што не патрабуе прыдумак, трайных прыёмаў і высілкаў. Рабіце даступнае. Адна маленькая здзейсненая справа вартая большага, чым сотні вялікіх запланаваных. Выратаванне дзяцей Афрыкі можа так і застацца нясправджанай ідэяй. А каля ганка ад голаду падыхае бяздомны сабака. Накарміце яго. І выратуеце цэлы свет.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■

# ВЫХАВАННЕ ФУТБОЛАМ...


Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**— Даводзілася чуць, што бацькі маленькіх футбалістаў не толькі прывозяць сваіх дзетак на трэніроўкі, але і спрабуюць неяк уплываць на трэніровачны працэс.**

— Адчуваць падобнае непрыемна. Бацькі прывялі дзіця на трэніроўку да спецыяліста, якому давяраюць, і на гэтым іх удзел у трэніровачным працэсе павінен скончыцца. Далей працуе трэнер, які цалкам кіруе камандай і адказвае за вынік. Я да іх звяртаюся: «Прыносьце сцягі, дудкі і падтрымлівайце сыноў, а куды бегчы, як адкрывацца на полі — гэта ўжо ў кампетэнцыі трэнера». Але ўсё роўна многія з іх спрабуюць і будуць спрабаваць рабіць па-свойму. Часам з дзіцем, у якога трэнер падчас заняткаў укладвае адно, а бацька дома вучыць зусім іншаму, працаваць бессэнсоўна. Што рабіць — прыходзіцца развітвацца.

**— Не менш дзіўным выглядае, калі з хлопца спрабуюць зрабіць футбаліста супраць яго волі.**

— Здараецца, што, акрамя жадання бацькоў, хлопчыка да заняткаў больш нішто не падштурхоўвае. У такім выпадку дарослым трэба адразу зразумець, для чаго яго прывялі ў секцыю. Калі дзеля паляпшэння здароўя, то лепш наведваць секцыі, якія дзейнічаюць пры кожнай сярэдняй школе. А спецыялізаваная школа пры футбольным клубе звязана са спортам высокіх дасягненняў. Прыходзіцца гэта тлумачыць. Але ўсе ўсё добра разумеюць, і ніякіх супярэчнасцяў у гэтым пытанні не ўзнікае.

**— Аляксандр Іванавіч, а вашых маленькіх падапечных можна назваць апантанымі футболам?**

— Яны ўсе розныя. Нехта да і пасля трэніроўкі актыўна абмяркоўвае еўрапейскія чэмпіянаты, паведамляе мне вынікі матчаў, а нехта яшчэ год назад мог прынесці на трэніроўку цацачную машынку. Яны яшчэ дзеці, аднак у тым, што могуць хутка пераключацца з футбола на нешта іншае, нічога дрэннага не бачу. Яны павінны валодаць сітуацыяй і ў іншых сферах жыцця.

**— Хлопчыкі раўняюцца на гульцоў дарослай каманды «Мінска»?**

— Пакуль яны лепш ведаюць Раналда і Месі, чым футбалістаў нашай асноўнай каманды. Але мы пастаянна ім расказваем пра наш футбольны клуб і пакрысе інтарэс да яго пачынае праяўляцца. І чым старэйшы ўзрост, тым большай становіцца зацікаўленасць сваёй камандай. Пры гэтым ФК «Мінск» заўжды аказвае дапамогу. Што казаць, калісьці некалькі пакаленняў хлопцаў гулялі ў адным камплекце формы. А цяпер кожная наша ўзроставая каманда мае па два гульнявыя камплекты. З дзіцячым футболам усё стала значна лепей, чым раней. Ды і выдаткі бацькоў мінімальныя ў параўнанні з тым жа хакеем і тэнісам.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# У СТРОГАСЦІ, ДЫ БЕЗ СУРОВАСЦІ

**— У нас, безумоўна, ёсць істотнае адрозненне ад іншых навучальных устаноў, — адзначае <u>намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Мінскага суворааўскага ваеннага вучылішча Дзмітрый ВАРАБЕЙ</u>, — бо мы — навучальная ўстанова ваеннага тыпу. І «мужчынскі складнік» выхавання ў нас, бадай, выяўляецца найбольш ярка. На 99 працэнтаў нашы выхавальнікі — мужчыны, афіцэры. У кожнай роце максімум 1–2 жанчыны: гэта псіхолаг і памочніца афіцэра-выхавальніка. Гэта зроблена наўмысна, бо мы сябе пазіцыянуем як другая сям'я для выхаванцаў, таму мусіць быць і «мама», з якой можна падзяліцца нейкай праблемай, і «тата», які захоўвае строгую дысцыпліну. З першых дзён знаходжання ў вучылішчы хлопцы робяць усё самі.**

**— Дарэчы, ці многія да гэтага гатовы? Або гэтаму трэба вучыць?**

— Апошнія гады падчас правядзення дзён адчыненых дзвярэй многія бацькі прыходзяць загадзя, нават з вельмі маленькімі дзецьмі, каб даведацца, як ім рыхтавацца і што рабіць. Першае, пра што мы гаворым: навучыце сына чысціць зубы, умывацца, самому мыць і прасаваць сваю бялізну — такія элементарныя бытавыя моманты не павінны быць для падлеткаў праблемай. Хлопцы знаходзяцца 24 гадзіны 7 дзён на тыдзень тут, таму мусяць умець абслугоўваць сябе самастойна. Нечаму, безумоўна, вучым, а потым паступова замацоўваем навыкі. Напрыклад, падчас прынесення ўрачыстай клятвы суворааўца старшы курс паказвае малодшаму, як прышываць пунсовыя пагоны. Правільна зрабіць гэта, між іншым, — вялікае ўменне, якое нават не ўсе мамы асвойваюць! …А далей мы заахвочваем выхаванцаў да самастойнасці, давяраем ім рабіць многія рэчы па-свойму, шукаць нейкія творчыя падыходы. Вялікае значэнне мае і тое, што ў нас стасункі будуюцца на роўных: афіцэры-выхавальнікі звяртаюцца да 12-гадовых юнакоў толькі на «вы», і ўжо з першага курса мы падкрэсліваем для сваіх выхаванцаў: вы — суворааўцы, не проста хлопчыкі, а сапраўдныя мужчыны. Гэта таксама важны выхаваўчы элемент, які падмацоўваецца жывымі прыкладамі, калі прыходзяць, напрыклад, самыя першыя выпускнікі 1956 года — генералы, міністры, кіраўнікі вядучых ведамстваў — і расказваюць, што ім дало вучылішча ў жыцці, кім яны сталі і як памятаюць і захоўваюць суворааўскія традыцыі.

…Дзмітрый Зігмундавіч малюе такую ідэальную карцінку, што я недаверліва перапытваю: няўжо не бывае тыповых «цяжкіх» падлеткаў, з якімі — і за якіх — даводзіцца як след паваяваць, каб вырасціць з іх годных мужчын? «Вядома, бываюць, — усміхаецца палкоўнік, — і многія бацькі допускаюць прабелы, якія робяцца заўважнымі падчас сталення хлопцаў, і самі хлопцы да нас трапляюць вельмі розныя і няпростыя; больш за палову выхаванцаў — з дзіцячых дамоў, з няпоўных або шматдзетных сем'яў… Але падыход можна знайсці абсалютна да кожнага. Непапраўных хлопцаў няма».

## Пытанне ў тэму

**— Ці можна мужчыну плакаць? Часам зусім малы карапуз вытнецца, енчыць, а бацькі выгаворваюць: «Цярпі, ты ж мужык…»**

— Тут падыходы ва ўсіх розныя. Усходнія мужчыны, напрыклад, не саромеюцца плакаць, у іх да выяўлення пачуццяў, можа, нават прыхільныя адносіны. Але, пагадзіцеся, афіцэр, які плача, — гэта дрэнна. Або калі бацька ў сям'і плача — гэта ўжо нагода для панікі, бо, відаць, становішча бязвыхаднае. Таму асабіста мая думка — публічна паказваць слёзы і разводзіць соплі нельга, бо гэта прыкмета слабасці. Можна паплакаць, калі ніхто не бачыць, але пры блізкіх трэба сабрацца і паказваць прыклад пераадолення ўсіх цяжкасцяў. Прынамсі, уласнага сына я выхоўваў менавіта так і ў слязах не бачыў яго, мабыць, гадоў з трох.



Суворааўцы на парадзе.

хлопец з сабой справіўся і ўжо не выказваў жадання пакінуць вучылішча. Наогул, пасля першага года адаптацыі хлопцы робяцца сапраўднымі сябрамі, і ўжо напрыканцы летніх канікул не могуць дачакацца сустрэчы з братамі-суворааўцамі».

**— Многія спецыялісты кажуць, што адна з асноўных праблем сучасных дзяцей — няўменне вырашаць канфлікты. Ці вучыце вы гэта рабіць?**

— Безумоўна, і раскажу, як. Гады тры таму нашы хлопцы на канікулах калектыўна пайшлі на дыскатэку. А не сакрэт, што да суворааўцаў пэўная частка моладзі ставіцца неадназначна, — вось і тут пасля дыскатэкі групоўка хуліганаў падсцерагла некалькіх суворааўцаў ля метро, каб «высветліць адносіны»… Потым мы доўга разбіралі гэты канфлікт — сабраліся ўсе разам і абмяркавалі, як можна было яго наогул пазбегчы. Прычым далі слова ўсім, каб хлопцы не баяліся выказваць сваю думку — няхай нават яна памылковая, але чалавек павінен выказаць сваю пазіцыю. Урэшце, хлопцы самі прыйшлі да высновы, што трэба, па-першае, заўжды трымацца разам (роту ў 20 чалавек ніхто б нават не адважыўся чапаць), а па-другое, паказваць узор карэктных паводзін, умець наогул не дапусціць канфлікту, не апусціцца да банальнай бойкі. Гэта і надалей вельмі спатрэбіцца ў жыцці, кім бы нашы выпускнікі ні сталі — вайскоўцамі, бізнесменамі, грамадскімі дзеячамі і г. д.

> **«Хлопцы да нас трапляюць вельмі розныя і няпростыя; больш за палову выхаванцаў — з дзіцячых дамоў, з няпоўных або шматдзетных сем'яў… Але падыход можна знайсці абсалютна да кожнага. Непапраўных хлопцаў няма».**

**— Нават самыя ўзорныя хлопцы могуць «зляцець з катушак» падчас пераходнага ўзросту. Як тут лепш дзейнічаць?**

— Так, мы ведаем гэты складаны перыяд — прыкладна 9-ы клас, калі ідзе выбух гармонаў, хлопцы могуць першы раз сур'ёзна закахацца, іх цягне ўсё пакаштаваць, выправаваць на сабе… Трэба скарэктаваць выхаваўчую работу ў гэтым узросце, каб не дапусціць зрываў, з'яўлення шкодных звычак. Каб не дапусціць, скажам, распаўсюджвання тых жа спайсаў, часам варта нават пайсці на жорсткія меры — мы правяраем, што перадаюць сябры і родныя, і калі ёсць сумненні наконт пэўных рэчаў, не прапускаем іх. Прапануем шмат альтэрнатыў шкодным звычкам — разнастайныя культпаходы, мастацкую самадзейнасць у вучылішчы, здаровы лад жыцця, удзел у спартыўных спаборніцтвах — словам, паказваем, што курыць і ўжываць наркотыкі нецікава і нямодна. Плюс, безумоўна, шмат працуюць нашы псіхолагі, каб замацаваць у хлопцаў унутраны стрыжань — што можна, а чаго нельга. Гэта методыка дае плён, нават бацькі часта заўважаюць, што сын стаў зусім іншым чалавекам, больш моцным, адказным, упэўненым у сабе.

У МСВУ суворааўцам шмат да чаго трэба прывыкнуць: «дамашнім» дзецям — да таго, што побач няма мамы; тым, каго збольшага выхоўвала вуліца — да разумення, што не ўсе канфлікты вырашаюцца сілай; замкнёным у сабе інтравертам — да пастаяннага знаходжання ў калектыве, да неабходнасці дзяліць з таварышамі абсалютна ўсё, ад супу ў сталоўцы да суседніх ложкаў. «Самае складанае — прыцірка характараў, — заўважае Дзмітрый Варабей, — прыкладна год патрэбен на тое, каб кагосьці мы «падцягнулі» да агульнага ўзроўню, кагосьці гіперактыўнага, наадварот, прывучылі да пачуцця адказнасці за ўчынкі і паводзіны — прычым не толькі за свае, а за ўвесь калектыў. Часта трэба працаваць не столькі з падлеткамі, колькі з бацькамі. Адна мама, сын якой цяжка адаптаваўся, знайшла «выйсце»: прыходзіла пасярод тыдня і прыносіла яму піражок, тым самым толькі пагаршаючы сітуацыю. Пакуль атрымалася адмяніць гэтыя піражкі, прайшла цэлая чвэрць, але ў выніку

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## «Суворааўскія» парады для бацькоў, у якіх растуць хлопчыкі:

▶ **Выхоўвайце самастойнасць, не душыце дзяцей празмернай апекай. Хлопчыка трэба рыхтаваць да таго, што ён — будучая апора сваёй сям'і. Нават 2–3-гадоваму малому можна даваць пэўныя даручэнні — ён будзе толькі рады іх выканаць.**

▶ Стаўцеся да свайго дзіця, як да дарослага, паважайце яго інтарэсы. Нават калі ваша дзіця ў чымсьці памыляецца, не трэба ляпіць на яго ярлыкі «ты дурань і нічога не разумееш» — лепш падкажыце і падштурхніце яго да правільнага рашэння.

▶ **Не адмахвайцеся ад яго праблем, не шкадуйце часу на тое, каб пагаварыць з дзіцем, абмеркаваць яго праблемы і спосабы іх вырашэння. Як бы вы ні былі загружаны працай, словы «адчапіся», «мне няма калі», «я заняты» не павінны гучаць занадта часта — інакш лёгка страціць кантакт з уласным дзіцем.**

▶ Аб'ектыўна ацэньвайце ўчынкі дзяцей: не сварыцеся па дробязях, але і не ўзносьце да нябёсаў. Аднак калі сын сапраўды заслужыў пахвалу ці крытыку — абавязкова выказвайце гэта. Не патрабуйце імгненных дасягненняў у любой справе, а калі ёсць нават невялікі прагрэс — заахвочвайце да далейшай працы.

▶ **Шукайце індывідуальны падыход. Няма ўніверсальнага рэцэпта выхавання і навучання дзяцей: аднаму патрэбен больш жорсткі кантроль, другому — спакойныя і падрабязныя тлумачэнні.**

■ Добрая справа

# ВЯРТАННЕ ДАДОМУ



## На адкрыцці экспазіцыі ў гонар сваіх славутых продкаў іх нашчадак Андрэй Дараган ледзь стрымліваў слёзы

**На ўрачыстую цырымонію ў Асіповічы праўнук былога ўладальніка асіповіцкіх земляў прыехаў разам з жонкай Ланай. Летась ён перадаў мясцоваму гісторыка-краязнаўчаму музею звыш 370 розных прадметаў, якія належалі яго шляхетнаму роду. Амаль год спатрэбіўся на тое, каб узаконіць замежны багаж, афарміць належным чынам падораныя рэчы і ўвасобіць у жыццё ўнікальны праект, прысвечаны роду Дараганаў.**

### АД ШКОЛЬНАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ ДА РАЁННАЙ

Для Асіповіч гэта наогул знакавае прозвішча. У пачатку мінулага стагоддзя менавіта Дараганы зрабілі для райцэнтра неацэнны падарунак. Дзякуючы ім тут з'явілася ветка чыгункі ад Асіповіч да Старых Дарог, паміж вёскамі Крынка і Дараганава была насыпана дарога, адкрыліся лесапільня, бровар і яшчэ шмат чаго. Пасля рэвалюцыі гэтае прозвішча было незаслужана выкраслена з гісторыі, а маёнткі галоўных рэалізатараў нават асіповіцкіх ідэй Восіпа і Мацвея вар'яцкі разрабаваны. Але амаль праз 100 гадоў яны зноў вяртаюцца ў Асіповічы. Экспазіцыя абяцае стаць сапраўднай іскрынкай гэтага раёна.

Экспанатаў, якімі падзяліўся праўнук Восіпа Дарагана, шмат: ледзь умясціліся ў 5 залах маладзёжна-падлеткавага цэнтра «Равеснік». Але самі па сабе яны б засталіся проста рэчамі, якія з часам перасталі б існаваць ці трапілі ў прыватныя калекцыі. І супрацоўнікі Асіповіцкага гісторыка-краязнаўчага музея пад кіраўніцтвам дырэктара Антаніны Сцяпанавай зрабілі ўсё магчымае для таго, каб прыдаць годнае афармленне гэтаму шчодраму падарунку. Шукалі па вёсках старадаўнюю мэблю, якая так добра перадае эпоху таго часу. Дамаўляліся з камандаваннем суседняй воінскай часці, каб дапамаглі прывезці і разгрузіць. У вольны час шылі шторы і абрусы для ўпрыгожвання зал, клеілі шпалеры, нават сваімі рукамі рабілі камін і грубку. Па дзяржпраграме «Культура Беларусі», на жаль, нічога летась не атрымалі. І калі б не райвыканкам, які выдаткаваў 50 мільёнаў рублёў, было б цяжка давесці справу да канца.

**Марыя Саканцава ўзгадала, што, калі яна разбірала экспанаты, у адным з іх знайшла цукеркі. «Цікава было б даведацца, хто і ад каго іх тут хаваў?»**

На адкрыцці выставы Андрэй і Лана выглядалі вельмі шчаслівымі. Шчыра дзякавалі ўсім, хто дапамог ім у ажыццяўленні не таннай па цяперашніх часах ідэі. Сардэчна абдымалі дырэктара школьнага музея Дараганаўскай школы Жанну Караленю. Па сутнасці, адраджэнне ўзаемаадносін пачалося з яе. Гэта яна некалькі гадоў таму знайшла парыжскі адрас прапраўнучкі Восіпа Дарагана Надзін Маршанд і падабрала ў лісце да яе такія словы, якія не пакінулі жанчыну абыякавай. І Надзін, якая ўпарта не адказвала ні на адно пасланне бадай 20 гадоў, адгукнулася. Яна падказала каардынаты іншых нашчадкаў, якія пачалі наведвацца ў свае былыя ўладанні. Сярод іх былі і Андрэй са сваёй жонкай Ланай. Менавіта тады яны выказалі думку стварыць асобны музей.

### І ЦУКЕРКІ Ў ПАДАРУНАК

Па-сапраўднаму рэдкіх экспанатаў у экспазіцыі шмат. Адзін сталовы сервіз «Blue Onion», ці «Сіняя цыбуля» на 69 прадметаў чаго варты. Гэта фаянс славутай англійскай фірмы Джонсан Брос, цудоўны ўзор для якога быў прыдуманы яшчэ ў 1739 годзе. Мастаку трэба было зрабіць малюнак у кітайскім стылі. Але атрымалася нешта ўмоўнае, што нагадвала звычайную цыбулю. Хоць гэта быў гібрыд лімона, персіка і граната. Узор спажыўцам, тым не менш, спадабаўся і яго пачалі капіраваць іншыя мануфактуры.



Лана ДАРАГАН са здымкам Восіпа Фёдаравіча ДАРАГАНА, дзе ён каля свайго маёнтка у асіповіцкіх Крынках (лета 1914 года).

У кожнай рэчы свая гісторыя і каштоўнасць. Напрыклад, косы і сярпы нагадваюць пра тое, што Дараганы былі працавітыя людзі, а жанчыны з іх роду, мяркуючы па насценных дыванах, лічыліся неблагімі майстрыхамі. Вялікая колькасць дарожных чамаданаў сведчыць, як шмат падарожнічала сям'я. А колькі гісторый магло б расказаць амаль стагадовай даўніны крэсла-качалка, якое перажыло перыяд эміграцыі. Яно так арганічна ўпісалася ў інтэр'ер, што здаецца, заўсёды стаяла тут каля каміна.



Той самы сервіз «Сіняя цыбуля».

Не абышлося і без кур'ёзнай інтрыгі. Старшы навуковы супрацоўнік музея Марыя Саканцава ўзгадала, што, калі яна разбірала экспанаты, у адным з іх знайшла цукеркі. «Цікава было б даведацца, хто і ад каго іх тут хаваў?» — спыталася яна падчас азнаямленчай экскурсіі ў Андрэя і Ланы.

— Гэта быў невялікі сюрпрыз, і мы рады, што цукеркі знойдзены, — шчыра прызналася Лана. — Андрэй хацеў зрабіць вам прыемнае, маўляў, стоміцеся, адкрыеце чарговую каробку, а там — цукеркі. Так што частуйцеся!

### ТАЯМНІЧЫ АБРАЗ

Андрэй і Лана глядзелі на падораныя імі экспанаты і не ўтойвалі свайго здзіўлення.

— Усё так добра зроблена, так шмат цудоўных ідэй, — прызнаўся Андрэй. — Я вярнуўся дадому. Я адчуваю сябе тут, як дома! Мы рады, што рэчы тут. Нашы дзеці і ўнукі — гэта ўжо іншае пакаленне. Яны не так разумеюць каштоўнасць гэтых прадметаў, могуць іх разбіць, прадаць. Музей — найлепшы спосаб захаваць гісторыю роду.

Шчодрыя падарункі атрымаў не толькі асіповіцкі музей. Некалькі гадоў таму некаторыя рэчы сям'і папоўнілі фонды Ваенна-марскога музея ў Санкт-Пецярбургу. У 1918 годзе, незадоўга да ад'езду Дзмітрыя Восіпавіча Дарагана, у дзверы яго санкт-пецярбургскай кватэры нехта пастукаў. Гэта быў апрануты ў цывільнае карабельны каплан. Калі ён расхінуў крысы свайго плашча, Дзмітрый убачыў абраз: Хрыстос, які ідзе па вадзе. Каплан перадаў яму яго са словамі: «Вы набожны чалавек, доблесны афіцэр, я спадзяюся, што вы захаваеце гэты абраз».

— Наш дзед прасіў: калі будзе створаны карабель «Андрэй Першазванны», перадай гэты абраз у карабельную царкву, — расказвае Лана. — Але такога карабля няма, і мы перадалі яго ў санкт-пецярбургскі музей. Спадзяёмся, што гэта справядліва. А сюды мы прывезлі ўсё, што датычылася беларускага перыяду жыцця Дараганаў. І абяцаем: экспазіцыя будзе расці. Дома мы знаходзім новыя і новыя рэчы, якія плануем прывезці сюды.

**Жанна падабрала ў лісце такія словы, якія не пакінулі жанчыну абыякавай. І Надзін, якая ўпарта не адказвала ні на адно пасланне бадай 20 гадоў, адгукнулася.**

Сужэнцы збіраюцца знайсці спонсараў, якія дапамогуць выкупіць для музея тыя рэчы, якія былі скрадзены ў 1918 годзе з асіповіцкага маёнтка. «Я асабіста бачыла ордэны і жэтоны Восіпа Фёдаравіча Дарагана, якія ён атрымаў у якасці начальніка Рыга-Арлоўскай чыгункі, — кажа Лана. — Яны павінны належаць гэтаму музею, як і іншыя сямейныя рэліквіі. Летам мы плануем зладзіць у Асіповічах вялікую сустрэчу Дараганаў, на якую ўжо запрасілі нашчадкаў з Францыі і Расіі. Разам мы абмяркуем, як дзейнічаць далей». А яшчэ Лана паабяцала, што экспазіцыя «Сям'я Дараган» заўсёды будуць упрыгожваць жывыя кветкі. Каб у кожнага, хто сюды прыйдзе, складалася ўражанне: гаспадары дома, проста яны на хвілінку выйшлі ў іншы пакой.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара** ■

**Уважаемые акционеры ОАО «Заводской райпищеторг»!**

**27 марта 2015 года в 10.00**
**состоится очередное общее собрание акционеров**
**ОАО «Заводской райпищеторг»**
**Собрание состоится по месту нахождения Общества по адресу: г. Минск, ул. Варвашени, 50.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

*1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2015 год, согласно разработанному в установленном порядке бизнес-плану.*

*2. О работе Наблюдательного совета в 2014 году. Оценка деятельности директора Общества наблюдательным советом. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе Общества.*

*3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год.*

*4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2014 год.*

*5. О распределении чистой прибыли за 2014 год. О выплате дивидендов за 2014 год.*

*6. О направлениях использования чистой прибыли в 2015 году и I квартале 2016 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2015 год.*

*7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.*

*8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.*

Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45 27 марта 2015 года по месту проведения собрания акционеров.

Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представитель акционера – и доверенность).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни – с $8^{45}$ до $17^{00}$ по месту нахождения Общества, начиная с 20 по 27 марта 2015 года.

Справки по телефону 243-52-98.

УНП 100103703 ***Наблюдательный совет***

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества
**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.**

| |
|---|
| **Продавец:** Витебский областной комитет природных ресурсов и охраны окружающей среды, г. Витебск, ул. Правды, 26А, тел. (0212)42-66-23. |
| **Лот №1.** Право на заключение договора аренды сроком на 3 года части капитального строения – помещений площадью 89,9 кв.м (в т.ч. 24, 22,8, 20,6, 22,5 кв.м), расположенных в капитальном строении с инвентарным №252/С-3726 по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, ул. Комсомольская, 10 для размещения офиса. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена:** 2 292 450 белорусских рублей. **Размер задатка:** 229 000 белорусских рублей. |
| Дата, время и место проведения аукциона: **23.03.2015 в 12.00** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи документов: **с 19.02.2015 с 8.30. по 20.03.2015 до 17.30.** |

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. №1049 (далее – Положение). Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов и в порядке, установленном главой 3 Положения. Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566.

**Контактный тел: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

Карту международного моторного страхования (страховой сертификат «Зеленая карта») серии BY/07/9655504; BY/07/9687485; BY/07/10940823 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительной в связи с утерей.**

